Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мін. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 204 4109)
ЧАЦЬВЕР, 30 ліпеня 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

КАРМАВУЮ БАЗУ—САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

ТЭМПЫ СЕНАЎБОРКІ ЗЬНІЗІЛІСЯ

13 раёнаў БССР яшче не выканалі нават і 30 проц. свайго пляну

Бярэце прыклад з Койданаўскага і Бягомльскага раёнаў, якія першымі ў БССР скончылі сенаўборку

Безадкладна пакласьці канец апартуністычнай стаўцы на самацёк, арганізаваць бесьперапынную кругласутачную работу на сенажацях. Да 5-га жніўня поўнасьцю скончыць сенаўборку і пераключыцца на падрыхтоўку да правядзеньня другога ўкосу.

У бой за другі бальшавіцкі ураджай

Буйнейшыя посьпехі, дасягнутыя БССР на аснове генэральнай лініі партыі па фронце веснавой сяўбы, высоўваюць адказьнейшыя, найскладнейшыя задачы па пасьпяховым завяршэньні перамог другой бальшавіцкай вясны — па ўборцы ўраджаю.

Засеўныя плошчы значна **пашырыліся.** Асабліва гэта адносіцца да **тэхкультур,** плошча пад якімі ўзрасла ў параўнаньні з мінулым годам на цэлых 60 проц. Шпаркае разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі патрабуе стварэньня магутнай **кармавой базы.** Перад намі стаіць сур'ёзнае пытаньне **гаспадарчага і арганізацыйнага замацаваньня шматлікіх новых калгасаў.**

Усё гэта высоўвае ўборачную кампанію ў лік рашаючых, кардынальных задач усёй КП(б)Б, усёй пралетарскай грамадзкасьці. Ад пасьпяховага правядзеньня ўборкі ўраджаю, правільнага разьмеркаваньня даходаў у калгасах, ад баявога правядзеньня асенняй сельска-гаспадарчай кампаніі ў вялізнай ступені залежыць рэалізацыя пляну вялікіх работ трэцяга году пяцігодкі, далейшае разьвіцьцё калгаснага руху.

Учора ў «Зьвязьдзе» апублікавана пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб ходзе ўборкі ўраджаю і падрыхтоўкі да асенняй сяўбы.

«Цэнтральны камітэт прызнае ход ажыцьцяўленьня ў БССР рашаючых мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць пасьпяховасьць кампаніі ўборкі ўраджаю і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМ».

Гэта ўказаньне цэнтральнага камітэту павінна **прыкавать** да сябе ўвагу партыйных і гаспадарчых арганізацый, павінна прымусіць неадкладна вынішчыць усе недахопы, па-баявому мабілізавацца на барацьбу за бальшавіцкія тэмпы работы.

Раней за ўсё, **ТРЭБА ЗАРАЗ-ЖА ДАБІЦЦА РЭЗКАГА ПЕРАЛОМУ Ў ХОДЗЕ СЕНАЎБОРКІ.** Недапушчальнае расьцягваньне тэрмінаў у гэтай галіне стварае непасрэдную небясьпеку для шпаркага і пасьпяховага разгортваньня ўборкі збожжавых і тэхнічных культур.

Такое становішча, што трынаццаць раёнаў ня выканалі нават і 30 проц. сваіх плянаў сенаўборкі, зусім нецярпіма. Трэба ўзяць раўненьне на **Койданаўскі і Бягомльскі** раёны, якія ўжо **скончылі сенаўборку.**

Дырэктыва ЦК КП(б)Б **аб сканчэньні ўборкі натуральных сенажацяй да 5 жніўня** павінна быць выканана ва што-б там ні стала.

Патрэбна неадкладна спыніць апартуністычныя скажэньні лініі партыі ў пытаньнях **РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ЎРАДЖАЮ,** факты якіх устаноўлены ў радзе раёнаў. Раздача кармоў павінна быць зараз-жа спынена да складаньня кармавых балянсаў, пакуль ня будзе забясьпечана кармамі абагулёнае стада, пакуль ня будзе вылучана неабходная колькасьць для здачы па кантрактацыйных дагаварох, для стварэньня браніяваных і запасных фондаў.

Пры разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў трэба цьвёрда прытрымлівацца прынцыпу **«хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае».** Разьмеркаваньне **па колькасьці і якасьці працы** зьяўляецца **адзіна правільным.** Выдача авансаў можа рабіцца толькі тым калгасьнікам, **якія выконваюць вытворчыя заданьні».**

«Лева»-апартуністычныя элемэнты, якія імкнуцца працягнуць дробнабуржуазную ўраўнілаўку, павінны сустрэць руйнуючы адпор. Трэба моцна ўдарыць па кулаку, які імкнецца сарваць гаспадарчае замацаваньне калгасаў. Кулацкай агітацыі за разьмеркаваньне кармоў «па дварох», «па каровах» і г. д., накіраванай на падтрымку «левакоў», трэба супроцьпаставіць **шырокую арганізацыйна-масавую работу,** супроцьпаставіць **укараненьне зьдзельшчыны** на аснове дакладнага **вучоту працы і запісу** яе ў кніжкі калгасьнікаў. Зьдзельшчына — магутны вагар узьняцьця прадукцыйнасьці працы, росту матар'яльнай зацікаўленасьці калгасьнікаў.

Пастановай ЦК КП(б)Б устаноўлены дакладныя тэрміны сканчэньня ўсіх этапаў уборачнай кампаніі.

Гэтыя тэрміны — ушчыльненыя, але **ЗУСІМ РЭАЛЬНЫЯ.** Правільная расстаноўка сіл, мабілізацыя найшырэйшых мас калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў вакол практычных задач уборкі, рашучая барацьба за генэральную лінію партыі забясьпечаць своячасовае выкананьне ўсіх задач, якія стаяць перад намі.

ЦК зьвяртае ўвагу на выключную важнасьць падрыхтоўкі і рацыянальнага скарыстаньня **МАСАВЫХ КАДРАЎ,** на своячасовае **выяўленьне і разьмеркаваньне лішкаў рабочай сілы.** У якасьці аднаго з канкрэтных мерапрыемстваў цэнтральны камітэт абавязвае НКЗ, Калгасцэнтр і райкомы КП(б)Б ажыцьцявіць **перакідку 30.000 калгасьнікаў для перанясеньня вопыту лепшых калгасаў у новыя.**

Значэньне першачарговай важнасьці набывае пытаньне прывядзеньня ў поўную баявую гатоўнасьць **ТРАКТАРНАГА ПАРКУ, УБОРАЧНЫХ МАШЫН І ЎСЯГО СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАГА ІНВЭНТАРУ, ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ВЫТВОРЧАСЬЦІ І ЗАВОЗУ МАШЫН.**

Пад асобны нагляд усёй КП(б)Б і рабочае клясы павінна быць узята **УБОРКА І РЭАЛІЗАЦЫЯ ЎРАДЖАЮ ТЭХКУЛЬТУР.** У гэтай галіне перад намі стаяць выключна адказныя задачы. Разьмеры пасеваў ільну і канапель патрабуюць асабліва пільнай падрыхтоўкі, асабліва выразнай арганізацыі працы. Між тым, ня гледзячы на крайня нязначны час, які застаўся да канца ўборкі ільну, падрыхтоўка яшчэ як належыць не разгарнулася. Ёсьць вельмі шмат няўвязак, непаладкаў у рабоце цэнтральных і мясцовых арганізацый, якія тармозяць справу. Гэтыя прарывы ў падрыхтоўчых работах павінны быць ліквідаваны ў самым неадкладным парадку.

Уборку ўраджаю нельга адрываць ад задач **ПАДРЫХТОЎКІ ДА АСЕНЬНЯЙ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ КАМПАНІІ,** ад задач **загатовак узорваньня пад зяблева, пашырэньня азімага кліну** і г. д. Гэта работа павінна разгарнуцца па ўсім фронце.

Ход сенаўборкі паказвае, што ў радзе раёнаў мае месца **недапушчальнае ігнараваньне аднаасобнага сэктару.** З падобнага роду зьявішчамі патрэбна рашуча пакончыць. Гэтыя памылкі не павінны больш паўтарацца.

Пастанова ЦК КП(б)Б дае цэнтральным і мясцовым арганізацыям канкрэтную праграму барацьбы за другі бальшавіцкі ўраджай. Гэта праграма павінна быць цалкам і ў тэрмін рэалізавана.

Вядучы жорсткую барацьбу на два фронты, укараняючы зьдзельшчыну і вучот работы на калгасных палёх, выразна расстаўляючы сілы, выкарчоўваючы абязьлічку і ўраўнілаўку, арганізуючы шырокую растлумачальную работу сярод аднаасобнікаў, правільна разьмяркоўваючы ўраджай і даходы ў калгасах, мы па-бальшавіцку ўбярэм ураджай, забясьпечым гэтым новы магутны калгасны прыліў, цьвёрда пойдзем па шляху ажыцьцяўленьня суцэльнай калектывізацыі і, на яе аснове, ліквідацыі кулацтва як клясы.

ЗВОДКА

аб ходзе касьбы і ўборкі сенажацяй па БССР на 25-VII 1931 г.

Сэктары.	Скошана натуральных сенажацяй: План.	Скошана.	Процант выкананьня.	Убрана.	Проц. выкананьня.
Саўгасы	73.033	88.107	52,2	41.606	86,9
Калгасы	752.621	425.055	56,5	694.607	65,7
Аднаасобнікі	1.049.567	522.699	49,8		
	1.875.221	985.861	52,6	736.213	65,8

Койданава і Бягомль

--пераможцы на сенажацях

Койданаўскі і Бягомльскі раёны першымі ў БССР скончылі касьбу. Койданаўскі раён скасіў 12.679 гэкт. сенажаці і ўбраў усё скошанае сена. Бягомльскі раён скасіў 11.216 гэкт.

Койданава і Бягомль на справе даказалі, што яны здольны змагацца за стварэньне кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Усім старшыням РВК

Сенаўборка праходзіць нездавальняюча. Тэрміны сканчэньня ўборкі прайшлі. Ёсьць значныя плошчы натуральных сенажацяй, якія ня скончаны ўборкай і скарыстоўваюцца пад выпасы. Ёсьць пагроза, што па асобных раёнах значныя плошчы застануцца няўбранымі.

Пад вашу адказнасьць правядзеце дэкаднік сенаўборкі, скончыўшы поўнасьцю ўборку сенажацяй 5-га жніўня. Разгарнеце арганізацыю ўдарных брыгад, адстаючыя сельсаветы, саўгасы і калгасы вазьмеце на грамадзкі буксір. Для кіраўніцтва справай дэкадніка мабілізуйце раённы актыў.

Нам. старшыні СНК БССР БЭНЭК.

Патроіць тэмпы на сенажацях

Да 5-га жніўня скончыць сенаўборку

Больш паловы грубых кармоў, якія ўваходзяць у кармовы балянс нашай жывёлагадоўлі, складае сена. Таму плян сенаўборкі ў гэтым годзе па БССР дасягае 1.875 тыс. гэкт.

Без барацьбы за поўнае выкананьне плянаў сенаўборкі, за стварэньне кармовай базы — немагчыма далейшае разгортваньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Між тым, выкананьне пляну сенаўборкі па рэспубліцы на 25-га ліпеня неэдавальняючае. Тэмпы разгортваньня сенаўборкі зусім невыстарчальныя.

За апошнюю пяцідзеўку выканана **ўсяго 8,1 проц. пляну сенаўборкі, за мінулую пяцідзеўку было выканана 15,6 проц. Такім чынам мы наглядаем зьніжэньне тэмпаў сенаўборкі як па ўсёй рэспубліцы, так і па сэктарох.** Калгасы за гэту пяцідзеўку выканалі ўсяго толькі 6 проц. свайго пляну, аднаасобнікі — 9,3 проц. Аднаасобны сэктар увесь час цягнецца ў хвасьце сенаўборкі, выканаўшы 49,8 проц. свайго пляну.

Толькі два раёны БССР — КОЙДАНАЎСКІ І БЯГОМЛЬСКІ — ужо скончылі ўборку сенажацяй.

21 раён набліжаецца да выкананьня пляну. Вось гэтыя раёны: **Хойніцкі, Глускі, Лепельскі, Чэрвеньскі, Чачэрскі, Цэрахаўскі, Брагінскі, Капыльскі, Нараўлянскі, Старобінскі, Сураскі, Камарынскі, Старадарожскі, Чырвона-Слабодзкі, Бялыніцкі, Сіроцінскі, Шклоўскі, Прапойскі, Каралінскі, Барысаўскі, Асілавіцкі.** У гэтых раёнах плян сенаўборкі выканан ад 94 да 71 проц.

13 раёнаў БССР ня выканалі **нават і 30 проц. свайго пляну сенаўборкі.** Сюды адносяцца такія раёны, як **Лоеўскі, Гомельскі, Бешанковіцкі, Мазырскі, Аршанскі, Парыцкі, Крычаўскі, Бярэзінскі, Пятрыкоўскі, Горацкі, Расонскі, Кармянскі і Ўраравіцкі. Лоеўскі** раён на працягу цэлага месяца не прысылае ніякіх вестак аб ходзе сенаўборкі.

Недапушчальна адстае таксама і ўборка сена і складваньне яго ў стагі. На 25-га ліпеня ўбрана **ЎСЯГО 65,8 ПРОЦ.** скошанага сена і шматтадовых траў. За апошнюю пяцідзеўку ўборка і складваньне сена ў стагі амаль не пасунуліся наперад — **0,7 проц. за пяцідзеўку.** Такое становішча з уборкай далей недапушчальна.

Прарывы па сенаўборцы зьяўляюцца простым вынікам апартуністычнай недаацэнкі ў радзе месц гэтай важнейшай кампаніі. Прыклад **Койданаўскага і Бягомльскага** раёнаў паказвае, чаго можна дасягнуць пры сапраўднай масавай рабоце на сенажацях, пры правільным скарыстаньні сіл.

Трэба безадкладна пакончыць з апартуністычнай стаўкай на самацёк, якая мае месца ў радзе раёнаў. Неабходна арганізаваць бесьперапынную кругласутачную работу на сенажацях. Там, дзе ўборка збожжа яшчэ не пачалася, неабходна мабілізаваць на касьбу ўсю наяўную цягавую і рабочую сілу. Там, дзе ўжо ідзе ўборка збожжа, неабходна спалучыць фарсаванае правядзеньне гэтых дзьвёх важнейшых кампаній.

У найбольш адстаючыя раёны, саўгасы і калгасы трэба безадкладна накіраваць адказных работнікаў як з цэнтру, так і з раёнаў, каб у бліжэйшыя-ж дні дабіцца рашучага пералому на сенажацях.

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» апублікавана пастанова бюро ЦК КП(б)Б, у якой апошні тэрмін сенаўборкі вызначан 5-та жніўня. **Дырэктыва партыі павінна быць ва што-б там ні стала выканана. Ніякіх далейшых адтэрміновак быць ня можа.**

Раёны, якія скончылі сенаўборку, павінны рыхтавацца да ўборкі другога ўкосу. Ні аднаго цэнтнэра няўбранага сена з другога ўкосу — гэта павінна стаць баявой задачай усіх раёнаў, саўгасаў і калгасаў. Пляны другога ўкосу трэба безадкладна давесьці да кожнага раёну, да кожнага саўгасу і калгасу.

Гэтыя пляны другога ўкосу, таксама, як і першага, павінны быць выкананы поўнасьцю. Толькі пры такіх умовах сапраўды можа быць створана моцная кармовая база для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Саўгасы на барацьбу за сена!

Забясьпечце кармамі сваё стада

Ход сенаўборкі па жывёлагадоўчых саўгасах **Белсаўгастрэсту і Сьвінавода** ідзе нездавальняюча. Саўгасы Белсаўгастрэсту на 25-га ліпеня скасілі толькі 53,9 проц. сваіх сенажацяй і шматтадовых траў. З 91 саўгасу **толькі 40 скончылі сенаўборку** згодна вызначаных плянаў. Рэшта саўгасаў адстае, прычым **27 саўгасаў ня ўбралі нават і паловы сваіх сенажацяй.**

Вось гэтыя саўгасы: **«Чырвоны бераг» —15 проц. пляну, «Доўгалесьсе» — 20 проц., «Ляскі» — 20 проц., «Капацэвічы» —21 проц., «Зорка захаду» — 18 проц., «Завольша» — 25 проц., «Веселева»— 26, «Лепішча» — 26, «Хотцы»—29 проц.**

У саўгасах «Абрубы», «Дуброва», «Камаровічы», «Заблоцьце», «Забегі», «Дзягілёва», «Натальлеўск», «Высокае», «Калініна», «Дойнічава», «Папажэвічы», «Ануфрава», «Раванічы», «Пакрашава», «Бярэзіна» і «Лучыцы» ўбрана ўсяго ад 30 да 49 проц. сенажацяй.

Не на многа лепш ідзе ўборка сенажацяй і ў саўгасах Сьвінавода, якія ўбралі пакуль толькі 66 проц. сенажацяй. Такія саўгасы, як **«ЛЕМНІЦА», «ЛУЧЫЦЫ», «ДРЫБІН», «СЯЛЕЦК», ІМЯ XVI ПАРТЗЬЕЗДУ, ІМЯ БУДЗЕННАГА, «ЗАРЭЧЧА», «РЫМЗ», «ВЯСНОВА», «СЬВІСЛАЧ», «ВАЙНІЛЫ», «БЯЛЫНІЧЫ»,** ня ўбралі і паловы сенажацяй. У саўгасе «Білышчы» ўбрана ўсяго 5%, а ў саўгасе «Вайнілы»—11,4 проц. сенажаці.

Гэтыя ганебныя тэмпы сенаўборкі ў радзе жывёлагадоўчых саўгасаў паказваюць, што як дырэктары, так і партыйныя ячэйкі і рабачкомы гэтых саўгасаў недаацэньваюць значэньня сенаўборкі, не мабілізавалі ўсіх сіл рабочых калектываў на стварэньне моцнай кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

„АНТАНОПАЛЬ", „Вішнёўка" і „Першае мая",

рабочыя саўгасу „Лучаўшчына" чакаюць вашага адказу

Як вы змагаецеся за кармы

Рабочыя сьвінагадоўчага саўгасу «Лучаўшчына» на 20-га ліпеня выканалі 122 проц. пляну сенаўборкі. У рапорце «Зьвязьдзе» і калторы Сьвінавода рабочыя абавязаліся на працяту ўсесаюзнага дэкадніка па завяршэньні сенаўборкі з 25-га ліпеня па 5-га жніўня ўбраць дадаткова атрыманыя яшчэ 35 гэкт. сенажаці і закончыць будаўніцтва сіласных ям і траншэй.

Рабочы калектыў гэтага саўгасу выклікаў пасьледаваць свайму прыкладу сьвінагадоўчыя саўгасы **«Антанопаль», «Вішнёўку і «Першае мая».**

У гэтых трох саўгасах сенаўборка ідзе неэдавальняюча. Так, саўгасы «Антанопаль» і «Першае мая» ўбралі 60 проц. сенажаці, а саўгас «Вішнёўка» — 66,2 проц.

З дня выкліку рабочых саўгасу «Лучаўшчына» ўжо прайшло тры дні. За гэты час вышэй паказаныя саўгасы ўжо маглі адгукнуцца на выклік сваіх таварышоў, але на сёнешні дзень рэдакцыя яшчэ не атрымала ад саўгасаў «Антанопаль», «Вішнёўка» і «Першае мая» ніякага адказу.

Мы чакаем ад калектываў гэтых саўгасаў паведамленьня аб тым, як яны змагаюцца за стварэньне кармовай базы і за сканчэньне сенаўборкі да 5-га жніўня.

Рэйд брыгад „Зьвязды" на ільназаводах

Будаўніцтва ільназаводаў першай чаргі праходзіць павольна

На 20 ліпеня будаўнічыя работы выкананы толькі на 25 проц.

Недаацэнка радам раённых арганізацый ударнага будаўніцтва, месьніцкія тэндэнцыі ў разьмеркаваньні будматар'ялаў, адсутнасьць спаборніцтва тармозяць своячасовы пуск заводаў

Узначаліць уздым спаборніцтва і ўдарніцтва на ільназаводах

Апошнія даныя аб ходзе будаўніцтва ільназаводаў паказваюць, што тэмп выкананьня будаўнічых работ вельмі павольны. Работы на заводах першай чаргі выкананы толькі на 35 проц. пры сярэднім выкананьні па ўсіх заводах на 25,5 проц. Вынікам няправільнага разьмеркаваньня будматар'ялаў з боку Белільнаканаплябуду і яго будаўнічых вучасткаў зьявілася тое, што палова заводаў першай чаргі далёка адсталі па выкананьні плянаў будаўніцтва ў параўнаньні з заводамі другой, трэцяй і нават чацьвертай чаргі. Так, па ВУШАЦКІМ заводзе работы выкананы на 12 проц., МЕЖАНСКІМ—18 проц., БАГУШЭЎСКІМ—10 проц., ГАРАДОЦКІМ—17 проц.

Як відаць, апошняя дэкада не дала значнага зруху на будаўніцтве гэтых заводаў. Белільнаканаплябуд павінен прыняць рашучыя меры як па лініі свайго апарату, так і па лініі будаўнічых вучасткаў і нападзіць правільнае разьмеркаваньне будматар'ялаў у адпаведнасьці з чарговасьцю будаўніцтва.

Ня ў меншай ступені на тэмп будаўніцтва ўплывае і тое, што рад раённых арганізацый адгарадзілі сябе ад ільназаводаў. Не забясьпечылі разгортваньня масавай работы і спаборніцтва сярод рабочых. Дагаворы па забесьпячэньні мясцовымі будматар'яламі рад РВК ня выконвае. Дэфіцытныя матар'ялы, якія ёсьць у радзе раёнаў, ляжаць не скарыстанымі ў той час, як з-за адсутнасьці гэтых матар'ялаў будаўніцтва ільназаводаў зрываецца. Гэтыя месьніцкія тэндэнцыі павінны быць неадкладна зжыты. Мясцовыя раённыя арганізацыі павінны праявіць максымум энэргіі і гібкасьці для забесьпячэньня пасьпяховага ходу будаўніцтва ільназаводаў.

У апошнія дні наглядаецца ўздым хвалі спаборніцтва і ўдарніцтва сярод рабочых ільназаводаў. Рад заводаў заключылі сацдагаворы і ўзялі канкрэтныя абавязкі. ЗАДАЧЫ РАЁННЫХ ПАРТЫЙНЫХ, САВЕЦКІХ І ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ СТАЦЬ НА ЧАЛЕ ГЭТАГА ЎЗДЫМУ І МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ РАБОЧЫХ НА БАРАЦЬБУ З ТОРМАЗАМІ БУДАЎНІЦТВА, НА БАРАЦЬБУ З БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЮ, ПРАГУЛАМІ, ДРЭННАЙ ЯКАСЬЦЮ РАБОТЫ. Трэба зрабіць, каб спаборніцтва і ўдарніцтва стала штодзённым мэтадам работы на ўдарных пабудовах, якія ПАВІННЫ БЫЦЬ СКОНЧАНЫ І ПУШЧАНЫ Ў ХОД СВАЯЧАСОВА.

ЗВОДКА

Белільнаканаплявдобуду аб ходзе будаўніцтва ільнапляньковых заводаў на 20-га ліпеня 1931 г.

Заводы	Лік турбін.	Тэрмін пуску	Вытворчасьць кар пусу.	Проц. выкананьня будаўн. Агульны проц. заводу.
Гарадоцкі	2	1-X	35	32,9
Любаньскі	1	1-X	25	22,7
Ветрынскі	1	1-X	72	44,5
Вушацкі	1	1 X	12	12,1
Межынскі	1	1-X	18	22,2
Багушэўскі	1	1-X	10	38
Гарадоцкі	1	1-X	17	24
Копыскі	1	1-X	42	43
Крупскі	1	1-X	85	53
Хоцімскі	1	1-X	29,5	39,7
Чырвонаполь.	-	1-X	44,7	46,8
Вульскі	1	1-XI	25	12
Высачанскі	1	1-XI	26	14
Бігосаўскі	1	1-XI	7	6,3
Дуброўенскі	1	1-XI	37	31
Лепельскі	1	1-XI	20	18
Халопеніцкі	1	1-XI	26	24
Чашніцкі	1	1-XI	23	18
Сураскі	2	1-XII	32	40
Горацкі	2	1-XII	34	77
Кармянскі Касьцюковіц.	1	1-XII	12,5	14
Чарэйскі	1	1-XII	22,2	15
Талачынскі	1	1-XII	43	33
Коханаўскі	1	1-XII	43	23
Крычаўскі	1	1-XII	25	13
Касьцюковіцкі	1	1-XII	12,5	14
Бялыніцкі	1	1-XII	24,4	21
Кармянскі ільняны	1	1-XII	20,3	15,8
Цэрахаўскі	1	1-XII	23	17,3
Ураравіцкі	1	1-XII	10	25
Пухавіцкі	1	1-XII	7	4
Расонскі	2	1-I-32 г.	18	11
Асьвейскі	2	1-I-32 г.	6	10
Бешанковіцкі	2	1-I-32 г.	40	29
Сіроцінскі	2	1-I-32 г.	39	23
Круглянскі	2	1-I-32 г.	29	44
Лядзянскі	2	1-I-32 г.	27,5	22
Сеньненскі	2	1-I-32 г.	12	15
Чавускі	2	1-I-32 г.	15	28
Мсьціслаўскі	2	1-I-32 г.	59	52
Касьцюковіцкі пянь.	1	1-I-32 г.	6,6	14
Магілеўскі	1	1-I-32 г.	4,5	19
Бабруйскі	1	1-I-32 г.	8	4
Рагачоўскі	1	1-I-32 г.	8	4
Рэчыцкі	1	1-I-32 г.	26	27,4
Агульны проц. па ўсіх завод.			26	25,5

Расьцягваюць абсталяваньне заводу

МЯЖА. (Брыгада «Зьвязды»). Забесьпячэньне будаўніцтва межынскага ільназаводу будаўнічымі матар'ялямі праходзіць дрэнна, што зьяўляецца аднай з галоўных прычын затрыманьня тэмпаў будаўніцтва заводаў. Віцебскі будаўнічы вучастак дасылае на завод патрэбныя матар'ялы са значным спазьненьнем, кіраўніцтва лесбелаўскага заводу № 13 зусім не зварачае ўвагі на якасьць піламатар'ялу, які высылаецца ім для будаўніцтва ільназаводу. Піламат'ялы ў большасьці выпадкаў не адпавядаюць вызначанаму ў нарадах асартымэнту.

Для пабудовы машыннага аддзяленьня і заканчэньня вытворчага корпусу патрэбна 25.000 шт. цэглы, шмат цьвікоў і сартовага жалеза. Між тым Віцебскі вучастак і Гарадоцкі райсампрамсаюз злачынна адцягваюць забесьпячэньне заводу патрэбнымі матар'ялямі.

Дырэктар заводу тав. Канафалаў ня прымае ніякіх мер для таго, каб забясьпечыць будаўніцтва інструментамі. Машыны, якія прыбываюць на завод, у выніку нядбайнасьці і безгаспадарчасьці тав. Канафалава, стаяць на станцыі **Бычыха** цэлымі месяцамі нявыкупленымі. Такія адносіны да машын прывялі да таго, што ў дасланай заводу турбіне выразалі на станцыі чвэрць мэтра гумовага паса і такім чынам турбіна выведзена са строю. Адміністрацыя заводу не клапоціцца аб тым, каб турбіну зараз-жа адрамантаваць.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва на заводзе не разгорнута. Партячэйка і прафарганізацыя заводу не займаюцца разгортваньнем масавай работы сярод рабочага калектыву.

Па ініцыятыве брыгады «Зьвязды» рабочыя заводу ўзялі на сябе абавязак закончыць будаўніцтва да 5-га жніўня. Гэты абавязак можа быць выканан толькі тады, калі гарадоцкі сампрамсаюз забясьпечыць будаўніцтва цэглай, віцебская будаўнічая група своячасова дашле заводу цьвікі і іншыя будаўнічыя матар'ялы, а партыйныя і прафесыянальныя арганізацыі заводу і адміністрацыя правільна арганізуюць усю работу на будаўніцтве.

Брыгада «Зьвязды»: ГАФТ, ГЛУШАК

Будаўнікі Чашніцкага ільназаводу, прымайце выклік вульскага заводу

ВУЛА. На пабудове вульскага ільназаводу адбыўся сход рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Сход узяў пад жорсткую крытыку усе тыя недахопы, якія затрымліваюць своячасовую пабудову ільназаводу.

Рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал абвясьцілі сябе ўдарнікамі на пабудове і выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва рабочых Чашніцкага ільназаводу.

Вось галоўныя пункты, якія абавязваюцца выканаць рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал: **1) падняць працдысцыпліну, зьнішчыўшы ўсе прагулы і прастоі, 2) падрыхтаваць завод для мантажных работ не пазьней 25 жніўня, 3) скончыць пабудову заводу датэрмінова на два тыдні, г. зн. 15 кастрычніка замест 1 лістапада.**

Адміністрацыя абавязуецца поўнасьцю забясьпечыць рабочых адпаведнымі інструментамі, скликаць вытворчыя нарады не радзей, як два разы ў месяц, і зьнішчыць усе недахопы ў галіне рабочага забясьпячэньня.

Тэхнічны пэрсанал абавязуецца у сувязі з недахватам будаўнічых дэфіцытных матар'ялаў, рацыянальна рабіць перакідкі рабочых з адной работы на другую.

Няма сродкаў для набыцьця цэглы

ДУБРОЎНА. На сёнешні дзень на будаўніцтве Дуброўенскага ільназаводу будаўнічыя работы выкананы, за выключэньнем мантажных, на 37,3 проц.

Галоўнымі прычынамі, якія затрымліваюць будаўніцтва, зьяўляецца недахват матар'ялаў. Цэглай будаўніцтва забясьпечана толькі на 70 проц. На Дуброўенскай цагельні ёсьць цэгла, але з-за адсутнасьці сродкаў яе нельга купіць. Трэба даць сродкі заводу для набыцьця цэглы.

Рабочыя ільназаводу прылі выклік Копысьскага ільназаводу на сацыялістычнае спаборніцтва і абавязаліся сябе ўдарнікамі.

Брыгада «Зьвязды»: ОСІПАЎ І БУХАВА.

Папраўка

У першым абзацы пастановы бюро ЦК КП(б)Б аб ходзе ўборкі ўраджаю і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы, апублікаванай ва ўчарашнім нумары «Зьвязды», па віне карэктуры, прапушчана слова, што скажае сэнс пастановы.

Першы абзац трэба чытаць так: **«Цэнтральны камітэт прызнае ход ажыцьцяўленьня ў БССР рашаючых мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць пасьпяховасьць кампаніі ўборкі ўраджаю і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы, нездавальняючым.**

Па-ўдарнаму выканаць дырэктывы ўраду БССР

Калгасцэнтр абавязан неадкладна распрацаваць каляндарны плян уборкі тэхкультур.—Скончыць падрыхтоўку масавых кадраў да 10 жніўня

Цэнтральныя зямельна-калгасныя і рад раённых арганізацый да гэтага часу ўсё яшчэ не пераключыліся на сапраўдны баявы падрыхтоўку да ўборкі і першапачатковай апрацоўкі тэхкультур. Белкалгасцэнтр і Бельільнасаюз амаль нічога не зрабілі, каб арганізаваць сапраўды ударную ўборку ільну і канапель.

Увага шырокіх мас рабочых саўгасаў і МТС, калгасьцікаў, бядняцка-серадняцкага сялянства і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці вакол пытаньняў уборкі і апрацоўкі тэхкультур не мабілізавана. Цэнтральны, раённа-нізавы друк таксама не аддае належнай увагі гэтым пытаньням. Калгасцэнтр БССР яшчэ нават ня спусьціў у раёны рабочых праграм па ўборцы і апрацоўцы ільну і канапель.

Будаўніцтва ільнаканаплявдобных заводаў — пад пагрозай зрыву. На 10-га ліпеня, ня гледзячы на забясьпечанасьць рабочай сілай, здавальняючае забясьпячэньне дэфіцытнымі будаўнічымі матар'ялямі (напрыклад, цьвікамі —на 22,2 проц., вапнай—на 57 проц., жалезам—на 22,5 проц.), плян будаўніцтва выканан усяго на 22 проц. Зусім яшчэ не пачата будаўніцтва Магілеўскага, Бабруйскага і Пухавіцкага заводаў.

Няправільнае разьмеркаваньне дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў бяз уліку чарговасьці будаўніцтва таго ці іншага заводу прывяло да таго, што заводы першай чаргі забясьпечаны цэглай на 45 проц., другой чаргі—на 60 проц., трэцяй—на 62%; цэментам заводы—першай чаргі—на 67%, другой—на 70%, трэцяй—на 76 проц. і чацьвертай — на 98 проц., цьвікамі заводы першай чаргі —на 24 проц., другой—на 23 проц., трэцяй—на 30 проц.; жалезам заводы першай чаргі—на 14 проц., другой—на 30 проц., трэцяй—на 23 проц. і чацьвертай —на 20 проц.

Дырэктывы партыі і ўраду аб будаўніцтве ільназаводаў у першую чаргу ў раёнах ільнаводчых МТС парушаны.

Белканаплявдобуд не забясьпечыў належнага апэрацыйнага кіраўніцтва будаўніцтвам, а паасобныя РВК усё яшчэ не аддаюць належнай увагі і не аказваюць рэальнай дапамогі ў гэтай справе.

Як тэмпы завозу ўборачных і ільнапрацоўчых машын, так і іх прасоўваньне ў саўгасы і калгасы не забясьпечваюць поўнага выкананьня пляну завозу да пачатку ўборкі.

Белсампрамсаюз не арганізаваў выробку ільнамалатарань «Эддзі», паставіўшы пад пагрозу зрыву своячасовае забясьпячэньне ільнаводчых саўгасаў і калгасаў машынамі на абмалоце ільну.

Калгасцэнтр і Ільнасаюз БССР, а таксама РВК уліку наяўных месц для сляньня і вадаёмаў для мачэньня ільну і канапель не наладзілі, не забясьпечылі арганізацыю новых мачыльных ям. Абсталяваньне пунктаў першапачатковай апрацоўкі ільну і канапель яшчэ амаль не распачата.

Такое наогул становішча з будаўніцтвам ільнаканапляных заводаў, якое канстатаваў СНК БССР на сваім пасяджэньні 23-га ліпеня. СНК вызначыў рад рашучых мерапрыемстваў па ліквідацыі адзначаных прарываў.

Калгасцэнтру БССР запрапанавана распрацаваць каляндарны плян уборкі тэхкультур з улікам напрамку сельскай гаспадаркі раёнаў. Не пазьней 10-га жніўня павінна быць скончана Калгасцэнтрам і аддзяленьнем Трактарацэнтру падрыхтоўка кадраў па ўборцы і апрацоўцы тэхнічных культур.

Пракурору рэспублікі даручана прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у несканчэньні ў тэрмін будаўніцтва ільназаводаў, у прыватнасьці Шклоўскага і Боркавіцкага.

Каб забясьпечыць своячасовы мантаж ільназаводаў, ВСНГ абавязан вылучыць са сваіх заводаў 25, Белсампрамсаюз—25 і заводы мясцовай прамысловасьці —15 кваліфікаваных рабочых.

МАШЫНЫ—УБОРАЧНАЙ

Гомсельмаш замацоўвае пералом

У дзень 1-га жніўня—вышэй сьцяг рэвалюцыйнай барацьбы!

Усе на вуліцу, на масавую дэманстрацыю супроць падрыхтоўкі новай бойні, у абарону СССР!

Камунараўцы запрашаюць дэлегацыю працоўных Зах. Беларусі на Кастрычніцкія ўрачыстасьці

За бесьперабойнае фінансаваньне пабудовы „518“ і „1040“

АШЧАДКАСЫ БССР ЗНІЗІЛІ

тэмпы сваёй работы

Прырост укладаў за першыя 2 дэкады 3-га кварталу ў дзесяць раз меншы, чым у адпаведныя дэкады 2 кварталу

При актыўным удзеле савецкай грамадзкасьці на аснове сацыялістычных мэтадаў працы даб'емся ліквідацыі прарываў у ашчаднай справе

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

аб ходзе мабілізацыі сродкаў па БССР

Паводле даных Наркамфіну **на 20 ліпеня** месячны плян мабілізацыі сродкаў па БССР выканан у сярэднім на 40,5 проц. Наперадзе ідуць наступныя раёны: **Сіроцінскі**—100,1 проц. пляну, **Сеньненскі**—61 проц., **Дрысенскі**—66,1 проц., **Полацкі**—59 проц.

Ганебна адстаюць: **Вушацкі** раён, які даў 11,8 проц. пляну, **Дубровенскі**—12,1 проц., **Клічаўскі**—13,1 проц., **Чырвонапольскі**—15,5 проц., **Лельчыцкі**—10,8 проц., **Тураўскі**—14,1 проц., **Уваравіцкі**—18,1 проц., **Церахаўскі**—16,7 проц., **Чэрвеньскі**—14,6 проц.

ЗАВАЯВАЦЬ ПЕРАЛОМ!

Ашчадкасы БССР скончылі першае паўгодзьдзе 3-га рашаючага году пяцігодкі з вялікімі прарывамі па ўсіх галінах работы.

На працягу бягучага году па БССР паводле пляну алічаны быць адкрыты 792 новыя касы, з іх 75 проц. на працягу першага паўгодзьдзя. Аднак, гэты плян ня выканан. У першым паўгодзьдзі адкрыта толькі 285 новых кас. Гэта складае 36 проц. агульнага заданьня. Гэты прарыў прыйшоў да невыкананьня дырэктывы аб паляпшэньні абслугоўваньня разрахункових функцый сельсаветаў, бо адкрыцьцё новай сеткі ідзе праходзіць асабліва дрэнна на вёсцы. У той час, як па гарадох плян адкрыцьця новых ашчадкас выканан на 45,7 проц., па вёсцы ён выканан толькі на 30,6 проц. Лёзьнянскі, Шкловскі, Мазырскі, Лоеўскі, Капыльскі, Лепельскі, Сураскі, Сененьскі і інш. раёны за 1-е паўгодзьдзе **не адкрылі ніводнай новай касы.** Між тым, у Мазырскім раёне, напрыклад, ёсьць каля 10 чалавек, якія скончылі курсы па ашчадсправе і каля 1-6 быць ацэнасьцю скарыстаны у новай сетцы ашчадкас.

Замест прыліву—адліў

Гадавы плян уцягненьня фізычных укладаў за першае паўгодзьдзе выкананы на 26,7 проц., прычым па горадзе заданьне выканана на 33,1 проц., а па вёсцы ўсяго на 19,4 проц. Раёны, якія загарнулі сапраўды ўдарныя тэмпы работы, дабіліся пасьпяховага выкананьня і перавыкананьня заданьняў. Так, Чэрвеньскі раён выканаў па ўцягненьні фізычных укладаў 159 проц. заданьня, Дуэльдзенскі—108 проц., Крупскі—104 проц.; 5 раёнаў выканалі заданьне ад 90 да 100 проц. 12-жа раёнаў, у тым ліку **Быхаўскі, Веткаўскі, Лоеўскі, Чаусскі, Сеньненскі** і інш. замест прыліву, далі адліў у суме 112 тыс. руб.

Ня выканаты таксама і касавы плян па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» першага выпуску. Недабор складае каля 4-х міл. рублёў.

Тэмпы зьнізіліся

У 3-м квартале ашчадкасы БССР сталі перад фактам неабходнасьці ўдасканаленьня тэмпаў работы з тым, каб ліквідаваць прарывы першага паўгодзьдзя і поўнасьцю выканаць плян другога паўгодзьдзя.

Аднак, весткі, якія ёсьць за першыя дзьве дэкады трэцяга кварталу, паказваюць, што тэмпы работы ня толькі не ўзмацніліся, а нават значна зьнізіліся супроць тэмпаў другога і першага кварталу. У той час, калі першыя дзьве дэкады другога кварталу далі прырост фізычных укладаў на 330 тыс. рублёў, дзьве дэкады трэцяга кварталу далі прырост толькі на 33,2 тыс. рублёў. Па пясковых-жа касах мы маем замест прыросту адліў фізычных укладаў на 22.400 рублёў.

Чым-жа тлумачацца гэтыя ганебныя прарывы?

У чым корань зла?

Асноўная прычына — апартуністычная недацэнка мабілізацыі сродкаў з боку часткі раённых арганізацый, якія лічаць гэту справу другараднай і нічога ня робяць для забесьпячэньня выкананьня пляну. Чым інакш, як не апартуністычнай недацэнкай барацьбы за фінплян можна вытлумачыць той факт, што на пленуме Сураскага РК КП(б)Б не далі слова загадчыку райбанку аб рэалізацыі пазыкі «3-ці рашаючы»?

Заслаўскі РВК выкідвае ашчадную касу са спецыяльна-абсталяванага для яе памяшканьня. Лоеўскі РВК зьнімае з работы загадчыка райашчадкасы рабочага-выдуначца, які поўнасьцю сябе апраўдаў, і прызначае яго інструктарам райспажыўсаюзу. Загадчыкам-жа райкасы РВК вылучыў былога старшыню сельсавету, зьнятага з працы як няздольнага справіцца з работай.

„Няма часу займацца ашчаднымі справамі“

Такіх фактаў вельмі шмат. У радзе раёнаў, ня гледячы на зусім выразныя пастановы дырэктыўных органаў, загадчыкаў ашчадкас адкрываюць ад іх непасрэднай работы і пасылаюць на правядзеньне іншых кампаній, прычым ня рэдка на гэты тэрмін закрываюць ашчадкасы.

У Лоеўскім раёне райкамсад злачынна бязьдзейнічаў, на працягу ўсяго часу нават ні разу ня выбіраўся. РКК-РСІ, разгледзеўшы гэту справу, замест рэальных мер уньдзеяньня вынесла пастанову, што, маў, «камсад нельга абвінавачваць у бязьдзейнасьці, бо ў ім знаходзіцца ўсе адказныя работнікі, якім няма часу займацца ашчаднымі справамі».

Вышэй тэмпы барацьбы за фінплян!

Патрэбен рашучы пералом. Другое паўгодзьдзе павінна прайсьці пад знакам сапраўды ўдарнай бальшавіцкай работы ашчадкас. Ашчадкасы павінны забясьпечыць уцягненьне фізычных укладаў у суме каля 8 міл. рублёў, рэалізацыю пазыкі «3-ці рашаючы» ў суме каля 42 міл. руб. Гэтыя задачы патрабуюць напружаньня ўсіх сіл, энэргіі і ініцыятывы. Задачы — зусім рэальныя і пры актыўным удзеле шырокай пралетарскай грамадзкасьці могуць і будуць выкананы.

Прафсаюзы і камсамол, тварам да ашчадсправы!

Прафсаюзы павінны рашуча павярнуцца тварам да ашчадсправы, мабілізаваць шырокую думку пралетарскай грамадзкасьці вакол барацьбы за фінплян.

Камсамол прымае невыстарчальны ўдзел у рэалізацыі пазыкі і наогул у ашчаднай справе. Гэта падкрэсьлівалася ўжо ня раз у пастановах дырэктыўных органаў і ў друку. Ленінскі камсамол павінен неадкладна мабілізаваць усю арганізацыю на барацьбу за выкананьне плянавай мабілізацыі сродкаў, забясьпечыць поўнае выкананьне дырэктыў ЦК ЛКСМБ аб тым, што кожны камсамолец павінен завербаваць ня менш 6 новых падпісчыкаў на пазыку, што кожны камсамолец павінен абазвяцца зьяўляцца ўкладчыкам у ашчадкасу.

Фінансава-крэдытныя органы і ў першую чаргу касы ашчадкасы павінны перабудаваць сваю работу і наладзіць выразнае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў і ўкладчыкаў.

Перанясеньнем лепшых прыкладаў работы ў адстаючыя раёны шырокім разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва, бальшавіцкімі тэмпамі работы, рашучым адпорам кулацкай агітацыі супроць мабілізацыі сродкаў — ашчадкасы БССР з посьпехам выканаюць пастаўленыя партыяй і ўрадам задачы—ліквідуюць прарывы першага паўгодзьдзя і поўнасьцю выканаюць фінплян другога паўгодзьдзя.

М. А. Рабцэвіч.

Да рабочых і працоўнага сялянства Заходняй Беларусі!

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Некалькі дзён аддзяляе нас ад міжнароднага чырвонага дня — 1-га жніўня. Ужо зараз буржуазія ўсяго сьвету, асабліва «вашай» фашысцкай Польшчы, самая агалцелая, самая крывавэрная, мабілізуе ўсю паліцыю і фашысцкія арганізацыі, каб у меры крыві патапіць рабочыя дэманстрацыі пратэсту супроць падрыхтоўкі новай крывавай бойні, супроць падрыхтоўкі контр-рэвалюцыйнага нападу на Савецкі Саюз, дзе нябывалымі ў гісторыі тэмпамі рабочая клясьа і працоўнае сялянства пад кіраўніцтвам кампартыі і яе пенінскага ЦК, на чале з тав. Сталіным будуюць сацыялізм.

Фашысцкая Польшча, як і ўвесь капіталістычны сьвет, задыхаецца ў ціскох гаспадарчага крызісу. Польскі фашызм, польскія зубры-памешчыкі ня могуць спакойна глядзець як рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу, прагнаўшы іх, самі, СВАІМІ ЎЛАСНЫМІ РУКАМІ, БЕЗ ДАПАМОГІ КАПІТАЛІСТАЎ, БУДУЮЦЬ САЦЫЯЛІЗМ. Імпэрыялістычная Польшча, як і ўсе сусьветныя імпэрыялістычныя драпежнікі, ня можа пагадзіцца з тым фактам, што тут за мяжою побач знаходзіцца рэспубліка Саветаў, адно існаваньне якое рэвалюцыянізуе працоўныя масы ўсяго сьвету.

І ёсьць з чаго шалець ад злобы імпэрыялістычным акулам. У той час, як увесь капіталістычны сьвет задыхаецца ад крызісу, калі капіталістычная сыстэма руйнуецца, калі капіталізм з гапаваннем кружлівай шпаркасьцю ляціць у бязданьне, а ў фашысцкай Польшчы амаль што другі рабочы беспрацоўны,—тут, у Савецкім Саюзе, а ў тым ліку і ў нашай БССР, НЯМА БЕСПРАЦОЎЯ, БЕСПРАЦОЎЕ Ў НАС ЛІКВІДАВАНА. Нават больш таго, калі ў вас, у фашысцкай Польшчы, асабліва ў Заходняй Беларусі тысячы кваліфікаваных рабочых—беспрацоўныя і паміраюць з голаду, У НАС НЕ ХАПАЕ НАВАТ ЧОРНАРАБОЧЫХ.

Найлепшым прыкладам таго, што можа зрабіць, чаго можа дасягнуць ПРАЛЕТАРЫЯТ СВАЁЙ СВАБОДНАЙ ПРАЦАЙ БЕЗ КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ АПЕКІ, працуючы на сябе, а не на эксплёататараў, можа служыць хаця-б наш завод «КАМУНАР». НАШ ЗАВОД У ПОЎНЫМ СЭНСЕ СЛОВА — ДЗІЦЯ КАСТРЫЧНІКА. Ён пабудаваны з руін былых заводзікаў Якобсона і Ліўшыца і складаўся толькі з аднаго ліцейнага цэху і мізэрнага сьлясарнага, дзе працавала ўсяго толькі некалькі дзесяткаў рабочых, і медна-ліцейнага заводу Яноўскага. Якая-ж спадчына пасьля буржуазіі засталася нам? Што мы атрымалі?

У часе імпэрыялістычнай вайны ўсе машыны з гэтых абодвух заводзікаў былі вывезены або зьнішчаны нямецкімі, а потым і польскімі акупантамі. Ад капіталістычных гаспадароў мы атрымалі напоўразваленыя голыя сьцены. Мы самі гэты завод будавалі, не на замежныя капіталы, а ЗА СВАЕ ЎЛАСНЫЯ ЗЬБЕРАЖЭНЬНІ, НА ЗЬБЕРАЖЭНЬНІ ПРАЦОЎНЫХ САВЕЦКАГА САЮЗУ. НАМІ ПАБУДАВАНЫ ТРЫ НОВЫЯ КАРПУСЫ І ЗАРАЗ БУДУЕЦЦА ЧАЦЬВЕРТЫ — адзін з вялізарнейшых цэхаў нашага заводу, які будзе ЎВЕСЬ МЭХАНІЗОВАН. Наш завод да гэтага часу займаў плошчу ў 2,6 ГЭКТАРАЎ, пасьля-ж пабудовы новага цэху будзе пасьля-ж пабудовы новага цэху будзе займаць 4,6 ГЭКТАРАЎ. На нашых вачох рос і вырас гэты завод у досыць буйны варштат сацыялістычнага будаўніцтва. Зараз завод прадстаўне сабою буйную прамысловую адзінку. На ім працуе 1.100 РАБОЧЫХ. Завод выпускае камнядрабілкі, ціскі, сьвідравальныя і бэтонныя варштаты, с.-г. інвэнтар і розныя іншыя машыны для будаўніцтва сацыялістычнай гаспадаркі. Прадукцыя заводу ў 1928-29 г. складала 1.711.917 РУБ., а ў бягучым годзе дасьць 5.890.000 руб. Праца ў нас свабодная, існуючая на сацыялістычных мэтадах —спаборніцтве і ўдарніцтве. У нас няма 12-14-гадзіннага рабочага дня, што калісьці было пры капіталістах і зараз у вас. Мы ўжо год, як перайшлі НА 7-ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ.

За два гады пяцігодкі і ва ўдарным квартале, дзякуючы сацыялістычным мэтадам працы—сацспаборніцтву і ўдарніцтву,—намі ВЫКАНАНЫ І ПЕРАВЫКАНАНЫ ЎСЁ КОЛЬКАСНЫЯ І ЯКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ ПЛЯНУ, за што мы атрымалі адзін з трох пераходных сьцягаў імя ЦК ЛКСМБ. Чэрвеньскі плян бягучага году намі выканан НА 99 ПРОЦ.

Усе гэтыя дасягненьні мы маем дзякуючы сацыялістычным мэтадам працы, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйнага калектыву.

Розныя прадажныя пісакі, а таксама сацыял-фашысты і беларускія нацыянал-фашысты, вы чулі ня раз, льлюць мора грязі і хлусьні на Савецкі Саюз, у прыватнасьці на БССР, што ў нас існуе «прымусовая» праца, што рабочаму Савецкага Саюзу жывецца горш нават чым у капіталістычных краінах, што ў нас «рабскія» ўмовы працы і іншае глупства. Няхай прыедуць вашы прадстаўнікі і дарагія браты да нас у БССР, на наш завод і няхай свайі ўласныя вачыма пераканаюцца, што такія ўмовы працы, якія маем зараз мы, РАБОЧЫ НЯ МАЕ НІ Ў АДНЭЙ КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ КРАІНЕ, ШТО ТАКІЯ ЎМОВЫ ПРАЦЫ МОГУЦЬ БЫЦЬ ТОЛЬКІ ТАМ, ДЗЕ ЎЛАДА ЗНАХОДЗІЦЦА Ў РУКАХ ПРАЛЕТАРЫЯТУ. У той час, калі вы працуеце па 12 і больш гадзін у цесных і брудных пакоях, у надзвычай дрэнных антысанітарных умовах, калі вас выціскаюцца капіталістычнымі драпежнікамі апошнія сокі і вы за свою 12-14-гадзінную катаржную працу атрымліваеце капейкі,—тут у нас уся ўвага нашай улады накіравана на тое, каб палягчыць фізычную працу чалавека, максымальна замяніць яе тахнікай.

Але не бяз труднасьцяй, не самацёкам, не без барацьбы праходзіць у нас праца. Гэту працу трэба было сьпярша арганізаваць. На нашым заводзе ёсьць яшчэ прагульшчыкі, рвачы і розныя падгапоскі апартуністаў. Таму сацбудаўніцтва ў нас адбываецца ва ўмовах жорстнай клясавай барацьбы. Усіх гэтых варожых нам элементаў мы выкрываем, і як пустазельле, выкідваем са сваіх радоў, з радоў будаўнікоў сацыялізму.

На заводзе з 1.100 чалавек на 1 чэрвеня было 750 УДАРНІКАЎ. За першае паўгодзьдзе г. г. 172 УДАРНІКІ ЗА ЎЗОРНУЮ ЎДАРНУЮ ПРАЦУ, ЗА ЦЭЛЫ РАД РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ ПРЭМІЯВАНЫ. Побач з ростам заводу, з ростам польскасьці рабочых расьце і партыйная арганізацыя. Зараз на заводзе налічваецца 240 камуністаў і 224 камсамольцы. Камсамольскае ядро нашага заводу толькі за апошняе паўгодзьдзе вырасла на 120 чалавек.

У той час, як у фашысцкай Польшчы, асабліва ў Зах. Беларусі, кожны дзень закрываюцца ўсё новыя і новыя фабрыкі і заводы, у нас растуць усё новыя фабрыкі і заводы, у нас жыцьцё бурліць, б'е крыніцай. У той час, калі ў вас рабочыя ня маюць дзе прыпажыць сваёй працы, армія беспрацоўных бязупынна расьце, сотні тысяч беспрацоўных гападаюць— у нас рабочых рук не хапае. Для забесьпячэньня заводу рабочай сілай ужо заключан дагавор з падшэфным калгасам.

Па меры росту эканамічнай магутнасьці нашага Саюзу палепшаюцца і ўмовы жыцьця рабочае клясы. У нас нашай уладай усё робіцца для таго, каб палепшыць матар'яльнае становішча працоўных мас, каб палепшыць іх дабрабыт. Так, ТОЛЬКІ Ў БЯГУЧЫМ ГОДЗЕ НАШЫМ ЗАВОДАМ ДЛЯ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ РАБОЧЫХ ІКВАТЭРАМІ БУДУЮЦЦА ДАМЫ НА 200 КВАТЭР. МЫ МАЕМ СВАЮ СТАЛОЎКУ, СВАЮ ПРЫГАРАДНУЮ ГАСПАДАРКУ, дзе мы самі працуем і адкуль забясьпечваем чамсткова сябе прадуктамі. МЫ МАЕМ СВОЙ ЗАКРЫТЫ КААПЭРАТЫЎ, СВОЙ СЬВІКАРНІК. Для задавальненьня культурных патраб рабочых заводу мы маем сваю бібліятэку, сваю дзіцячую пляцоўку, ВЫДАЕМ СВАЮ ЗАВОДЗКУЮ ГАЗЭТУ, будуем свой клюб і для павышэньня кваліфікацыі рабочых, згодна заклікам нашага правадыра тов. СТАЛІНА Ў БЯГУЧЫМ ГОДЗЕ ПРЫ ЗАВОДЗЕ АДКРЫВАЕЦЦА ТЭХНІКУМ З 4-ГАДОВЫМ НАВУЧАНЬНЕМ.

З вялікай увагай і напружаньнем мы сочым за вашай гэраічнай барацьбой супроць улады акупантаў, за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Мы чуем страляніну, чуем енкі катаваных нашых братоў па клясе ў фашысцкіх засьцянках і за турэмнымі кратамі. Мы ведаем пра карныя экспэдыцыі польскай паліцэйшчыны на акупаваных вашых землях, мы ведаем аб высылцы ўсіх рэвалюцыйных рабочых і сялян з Зах. Беларусі ў далёкую Пазяншчыну. Усё гэта мы чуем і наглядаем ня як ста ронныя назіральнікі. ВАША СПРАВА—ЁСЬЦЬ наша справа. Нашы сымпатыі, нашы думкі разам з вамі. Пралетарскае прывітаньне вам у вашай гэраічнай барацьбе супроць фашысцкай дыктатуры!

Ведаеце, дарагія таварышы, што вызваліць вас з-пад ярма акупанцкай улады, ад барбарскай эксплёатацыі, голаду, галечы і жабрацтва можа ТОЛЬКІ ПРАЛЕТАРСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ, што шлях да гэтага ляжыць праз Кастрычнік. Дык сьмялей у бой супроць улады акупантаў і паесьнікаў!

Мы заклікаем вас у міжнародны чырвоны дзень вышэй узьняць сьцяг рэвалюцыйнай барацьбы. НЯХАЙ ВУЛІЦЫ ВЁСАК, МЯСТЭЧАК І ГАРАДОЎ ЗАПАЛАЮЦЬ ЧЫРВАНЬНЮ СЬЦЯГОЎ КПЗБ, ПАД ЯКІМІ ВЫ ПОЙДЗЕЦЕ НА АПОШНІ ШТУРМ ФАШЫСЦКАЙ ДЫКТАТУРЫ ЗА СВАЕ САЦЫЯЛЬНАЕ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ВЫЗВАЛЕНЬНЕ, ЗА РАБОЧА-СЯЛЯНСКІ ЎРАД, ЗА САВЕЦКУЮ ПОЛЬШЧУ!

Гарачае прывітаньне шлем вам у вашай гэраічнай барацьбе. МЫ ЗАПРАШАЕМ ВАС ПРЫСЛАЦЬ ДА НАС НА СЬВЯТКАВАНЬНЕ 14-ай ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА СВАІХ ДЭЛЕГАТАЎ, якія навочна пераканаюцца ў тых вялізарных дасягненьнях, якія мы маем дзякуючы дыктатуры пралетарыяту.

Няхай жыве КПП і КПЗБ — арганізатар і кіраўнік працоўных мас у надыходзячых рашаючых баёх за дыктатуру пралетарыяту!

Няхай жыве ЎсеКП(б) і яе пенінскі ЦК на чале з тав. Сталіным!

цоўных Зах. Беларусі і Польшчы!

цоўных Зах. Беларусі і Польшчы!!! !

У дзень 1-га жніўня ўсе на вуліцу, на дэманстрацыю супроць падрыхтоўкі новай сусьветнай бойні, ЗА АБАРОНУ ПЕРШАЙ У СЬВЕЦЕ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЭЯРЖАВЫ—СССР!

З нецярплівасьцю чакаем прыезду вашай дэлегацыі.

250 подпісаў рабочых «Камунара».

Барацьба за торф

ПЕРАТВАРЫЦЬ ТОРФРАБКОПЫ

ва ўдарныя цэхі забесьпячэньня

ТАРФЯНАЯ КААПЭРАЦЫЯ БССР НЕ ПЕРАКЛЮЧЫЛА СВАЁЙ РАБОТЫ НА УДАРНЫЯ ТЭМПЫ

Партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі акажэце канкрэтную дапамогу ў рабоце заводзкіх торфрабкопаў

Торфрабкопы закліканы партыяй аб слугоўваць **АДНУ З ВАЖНЕЙШЫХ ГАЛІН НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ — ТАРФЯНУЮ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ.**

Аднак, прыходзіцца канстатаваць, што арганізаваныя ў чэрвені месяцы ў сувязі з рэарганізацыяй каапэрацыйнай сыстэмы 13 торфрабкопаў у БССР далёка **НЯ СПРВІЛАСЯ З ВЫКАНАНЬНЕМ ТЫХ ВЯЛІЗАРНАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ВАЖНАСЬЦІ ЗАДАЧ, ЯКІЯ ЎСКЛАДЗЕНЫ НА ІХ ПАРТЫЯЙ І ЎРАДАМ.**

Торфсэкцыя Белкаапсаюзу, якая кіруе торфрабкопамі, да гэтага часу не дабілася пераводу торфрабкопаў па сапраўды ўдарныя тэмпы работы па абслугоўваньні рабочых тарфяпікаў.

Шматлікія матар'ялы з месц, якія ўжо зьмяшчаліся ў «Зьвязьдзе» і друкуюцца сёньня, сыгналізуюць аб радзе недапушчальных фактаў у рабоце паасобных торфрабкопаў, аб тым, што **АПАРАТ ТОРФРАБКОПАЎ УСЁ ЯШЧЭ НЕ ПЕРАБУДАВАЎ СВАЁЙ РАБОТЫ Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З ЗАДАЧАМІ, ЯКІЯ ПАСТАЎЛЕНЫ ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАМОВАЙ ТАВ. СТАЛІНА.**

Зараз торфсэкцыя Белкаапсаюзу ў сувязі з пастановай ЦК і СНК БССР аб торфараспрацоўках, дзе адзначаецца, што «органы спажывецкай каапэрацыі ня ўлічылі пасьпяховага выкананьня і перавыкананьня гадавога пляну торфараспрацовак і не арганізавалі належнага абслугоўваньня рабочых», — прыняла рад рашучых захадаў, ажыцьцяўленьне якіх зробіць карэнны пералом у рабоце торфрабкопаў.

Сэкцыя сумесна з ЦП саюзу тарфяной і слапцовай прамысловасьці накіравалі ва ўсе торфрабкопы сваіх брыгадзіраў, усклаўшы на іх задачу **ПА АКАЗАНЬНІ КАНКРЭТНАЙ ДАПАМОГІ АРГАНІЗАВАНЫМ ТОРФРАБКОПАМ І ПРАМТАВАРАЎ ДЛЯ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ТОРФАРАСПРАЦОВАК.**

Брыгадзіры паведамляюць, што на мясцох ёсьць рад недапушчальных фактаў галаваньнскіх адносін да хутчэйшай дастаўкі прыбываючых прадуктаў і прамтавараў, прызначаных спэцыяльна для торфзаводаў.

Шмат якія торфрабкопы на мясцох спазьняюцца з атрыманьнем прыбываючых грузаў.

Пункты Саюзхлеба ганебна ня выконваюць дырэктыўнага ліста канторы Саюзхлеба аб водпуску 5 проц. пшанічнай мукі з агульнай колькасьці жытняй і падалей выдаюць аднародныя крупы, у большасьці нарловыя.

Сталовыя ў большасьці працуюць дрэнна. Адсутнасьць кваліфікаваных паваароў не дае магчымасьці ўпесьці рознастайнасьць у мэню.

Зусім слаба праўленьні торфрабкопаў працуюць у напрамку адшуканьня дадатковага фонду прадуктаў **на мясцох** (як капусты, бульбы, гуркоў і інш. відаў гародніны), што таксама значна адбіваецца на лепшай пастаноўцы работы сталовак («Новая Беларусь», «1-е мая» і інш.).

Зараз торфсэкцыя дабілася пастановы Наркамснабу і БКС аб уключэньні торфрабкопаў у плян загатовак усіх відаў гародніны ў раёне сваёй дзейнасьці.

Даны нарады Белплодагароднінай на атрыманьне ад райсаюзаў у 3-м квартале 615 тон раньняй бульбы, 154 тон капусты, 77,3 тон гуркоў і г. д.

Адгрузка прамтавараў, як мыла, махорка і г. д., да гэтага часу ідзе слаба. На гэтым вучастку ёсьць значны прагрыў.

АДСЮЛЬ БАЯВАЯ ЗАДАЧА МЯСЦОВЫХ ПАРТЫЯНЫХ, ПРАФСАЮЗНЫХ, КАМСАМОЛЬСКІХ І ІНШЫХ ГРАМАДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ДАПАМАГЧЫ ТОРФРАБКОПАМ У НАЙКАРАЦЕЙШЫ ТЭРМІН ПЕРАВЕСЬЦІ РАБОТУ НА САПРАЎДЫ ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ.

ДРЭННАЯ ПРАЦА ТОРФРАБКОПУ—

прычына цякучасьці рабочай сілы

Торфазавод «1-е мая» ў апошні дні некалькі падцягнуўся ў сэнсе выкананьня прамфінпляну. Дзённае заданьне на 25-га ліпеня выканана на 107,3 проц., сэзоннае — на 35,[illegible] проц.

Вузкім месцам на заводзе зьяўляецца дрэнная праца торфрабкопу. Апошняе значна адбіваецца на выкананьні заводзкага прамфінпляну па торфаздабычы.

У выніку дрэннага забесьпячэньня рабочых прамтаварамі і нікуды нявартай пастаноўкі грамадзкага харчаваньня, пагладзецца вялікая цякучасьць рабсілы.

Арганізаваны сталоўкай сьвінарны двор, які павінен забясьпечыць сталовую тушчамі, застаўся без догляду. Сьвіньні цэлымі днямі стаяць на ёўнях.

Чашніцкі райкаапсаюз зусім не забясьпечвае сталовую прадуктамі.

На гэтыя ганебныя факты адносіны страныя заводакіраўніцтва не звяртаюць ніякай увагі.

А. Б.

Адкрыўся Усебеларускі зьезд прамкаапэрацыі

28-га ліпеня ў Доме Культуры адкрыўся 4-ы Ўсебеларускі зьезд прамысловай каапэрацыі. У рабоце зьезду прымаюць удзел 250 дэлегатаў, якія прадстаўляюць 50 тыс. чалавек арцеляй Белкаапрамсаюзу.

Зьезд адкрыў старшыня Белкаапрамсаюзу тав. **Брыскін**, які адзначыў, што зьезд павінен вызначыць канкрэтныя шляхі для рэалізацыі дырэктывы партыі і ўраду аб перабудове работы прамкаапэрацыі і ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінпляну.

У гапароры прэзыдыум абраны літбюро ЦК УсеКП(б), а таксама **Гей, Шаранговіч і Галадзед.**

Ад імя ЦК КП(б)Б і ўраду зьезд вітаў нам. старшыні Саўнаркома тав. **Бэнэк**, які падкрэсьліў, што прамкаапэрацыя ў сваёй далейшай работе павінна аддаць асаблівую ўвагу гортваньню промыслаў па торфзаводах, пагэлы. Наогул, павінен быць у больш рашучы курс на разьвіцьцё **промыслаў, якія працуюць на не**цытнай мясцовай сыравіну. Поўхі ў гэтай галіне трэба прызнаць дастатковымі.

Дэлегацыя Гомельшчыны перзьезду чырвоны сьцяг.

На гэтым-жа пасяджэньні зьезду некаторым арцелям БССР ўрадаў некаторым арцелям БССР ўрадамі і гапаровы лісты, атрыманы Усебеларускай сельска-гаспадарчай прамысловай выстаўкі за лепшы пашаны.

Зьезд пастанавіў паслаць прывітаньні тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і Ўсесаюзнаму каапэратыву прамысловаму савету.

Менскія ўдарнікі прамкаапэрацыі арганізавалі вялікую дэманстрацыю.

Да вынікаў месячніка генэральнай праверкі беларусізацыі

ПРАВЕРКУ ДАВЕСЬЦІ ДА КАНЦА

Не кампанейскі, а штодзённа змагацца за беларусізацыю, за карэнізацыю апарату

Не дапускаць апашленьня, аказёньваньня праверкі

Тэрмін, вызначаны ЦК КП(б)Б для месячніка генэральнай праверкі беларусізацыі, прайшоў. Аднак, праверка ў радзе месц ня скончана. Прычына гэтага заложана, галоўным чынам, у недадацэнцы папітычнага значэньня праверкі, у фармальных, часта казённых дазе адносінах з боку паасобных кіраўнікоў партыйных і савецкіх арганізацый.

Ня рэдкі выпадкі, калі пасьля вызначанага тэрміну праверачныя камісіі спынялі работу нават у тым выпадку, калі праверка яшчэ ня скончана.

Асабліва шкодныя зьяўляюцца элементы скажэньня дырэктыў партыі аб месячніку — апашленьне ідэі праверкі, аказёньваньне яе.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове падкрэсьліў, што «партыйныя арганізацыі ў часе месячніка праверкі беларусізацыі павінны мабілізаваць увагу шырокіх мас рабочых і ўсіх працоўных на рашучае ўзмацненьне барацьбы з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і яго агентурай у радох КП(б)Б — нацыянал-апартунізмам, антысэмітызмам і шавінізмам іншых нацыянальнасьцяй».

Аднак, гэтага не ўсьвядомілі ў радзе месц, гэтага не зразумелі ў прыватнасьці на чыгуначным вузле ў Віцебску. Праведзеная праверка беларусізацыі па VI эксплёатацыйным раёне МББ чыгункі зьяўляецца ўзорам фармальных казённых адносін камісіі да важэцыяўленьня важнейшай дырэктывы партыі.

Віцебскі гарком і цэлы рад іншых райкомаў КП(б)Б, дзе праверка праведзена падобным чынам, павінны правесьці яе нанава. Праверка дасьць патрэбныя вынікі толькі тады, калі будзе праведзена ШЫРОКАЕ РАСТЛУМАЧЭНЬНЕ АСНОЎ ЛЕНІНСКАЙ НАЦПАЛІТЫКІ, ТОЛЬКІ ТАДЫ, КАЛІ Ў ПРАВЕРКУ БУДУЦЬ УЦЯГНУТЫ МАСЫ партыйцаў, рабочых, калгасьнікаў, спэцыялістаў і ўсіх працоўных.

Мы гэта падкрэсьліваем таму, што факты (чыгуначны вузел у Віцебску і інш.) гавораць аб зьвядзеньні праверкі беларусізацыі да фармальнага экзамэну супрацоўнікаў пры АБСАЛЮТНЫМ ІГНАРАВАНЬНІ такога важнага папітычнага пытаньня, як карэнізацыя апарату.

Вынікі праверкі ў Мазырскім і радзе іншых раёнаў паказваюць, што ПААСОБНЫЯ ПАРТ'ЯЧЭЙКІ ня толькі НЕ СТАЯЦЬ НА ЧАЛЕ правядзеньня беларусізацыі, але самым грубым чынам ІГНАРУЮЦЬ пастановы пленумаў ЦК КП(б)Б па нацпытаньні, ПАТУРАЮЦЬ вялікадзяржаўным і іншым шавіністычным выпадам.

Мы маем усе падставы для таго, каб заявіць, што члены мазырскай каапэрацыйнай ячэйкі, у якой 68 проц. партыйцаў, ня ведаюць беларускай мовы, у якой заядлы вялікадзяржаўнік Дэканэнка не атрымлівае адпору, — НЕ АДЗІНОЧНЫЯ.

ГЭТА ТРЫВОЖНЫ СЫГНАЛ. Работа такой ячэйкі яраз на руку вялікадзяржаўнікам, яна (такая работа) льле ваду на млын беларускай контр-рэвалюцыйнай нац.-дэмакратыі.

Іменна таму парткамітэты павінны прыкласьці ўсе намаганьні, каб кожная партыйная ячэйка стаяла «на чале ўцягненьня шырокіх рабочых мас у справу культурнага будаўніцтва і ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, каб рабочыя масы, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ўзялі на сябе ініцыятыву ў вывучэньні беларускай мовы, гісторыі і эканоміі Беларусі, у ажыцьцяўленьні беларусізацыі апарату».

У выкананьне гэтай задачы, пастаўленай кастрычніцкім пленумам ЦК КП(б)Б, партарганізацыі ўжо дабіліся вялікіх посьпехаў. Задача заключаецца ў тым, каб, замацоўваючы той пералом, які бясспрэчна створан месячнікам, шырока выкарыстоўваючы вопыт варашыловаўцаў, з яшчэ большай упартасьцю змагацца за поўную беларусізацыю апарату і яго карэнізацыю, за поўнае выкананьне дырэктыў партыі па абслугоўваньні нацменшасьцяй.

Мы даб'емся найвялікшых посьпехаў у гэтай галіне толькі тады, калі кожная партыйная ячэйка, кожны партыец з бальшавіцкай непрымірымасьцю будуць выкрываць і змагацца супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, які прадстаўляе сабою галоўную небясьпеку на даным этапе, супроць беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-апартунізму, супроць усялякіх скажэньняў дырэктыў партыі ў нацыянальным пытаньні.

Праверкі зьвялі да фармальнага экзамэну паасобных супрацоўнікаў

Беларусізацыя ў рабоце 6-га эксплёатацыйнага раёну МББ чыгункі (Віцебск) праводзіцца зусім дрэнна. Разам з тым, што шыльды напісаны па-беларуску, справаводзтва вядзецца на беларускай мове. Сярод супрацоўнікаў існуюць настроі,

„НОВЫЯ ЎМОВЫ РАЗЬВІЦЬЦЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ патрабуюць работы па-новаму“ (Сталін)

МНОГІЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ БССР ЯШЧЭ НЯ ЎЗЯЛІ БАЛЬШАВІЦКІХ ТЭМПАЎ ПЕРАБУДОВЫ РАБОТЫ

Вытравіць абязьлічку, ураўнілаўку, надзеі на самацёк рабочай сілы, недаацэнку гаспадарчага разрахунку!

НА ВОПЫЦЕ БРЫГАДЫ ФІЛІПОВІЧА ВУЧЭЦЕСЯ ПРАВІЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ!

6 пунктаў

прамовы т. Сталіна ператварыць ў жыцьцё

У апошняй прамове тав. Сталіна аб задачах гаспадарчага будаўніцтва дан дакладны аналіз прычын прарываў у прамфікпляне, якія маюцца на радзе прадпрыемстваў.

І тав. Сталін у сваёй прамове даў разгорнутую праграму перабудовы форм і мэтадаў кіраўніцтва, вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы, якія павінны забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне планаў.

Як-жа партарганізацыі нашых прадпрыемстваў, гаспадарнікі, прафсаюзы і камсамол праводзяць гэту перабудову?

Матар'ялы, якія сёньня зьмяшчаюцца, паказваюць, што ў гэтай справе яшчэ НЯ ЎЗЯТЫ бальшавіцкія тэмпы.

ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК у большасьці існуе толькі фармальна («КАМУНАР», «КАСТРЫЧНІК» і інш.), АБЯЗЬЛІЧКА, УРАЎНІЛАЎКА Ў ЗАРПЛАЦЕ яшчэ не ліквідаваны (фабрыка «КАСТРЫЧНІК», ЗАВОД «ПОЛЫМЯ РЭВАЛЮЦЫІ» і інш.). АРГАНІЗАВАНАЯ ВЯРБОЎКА РАБОЧАЙ СІЛЫ нападаваецца надзвычай павольнымі тэмпамі. КУЛЬТУРНА-БЫТАВОЕ АБСЛУГОЎВАНЬНЕ — усё яшчэ забыты вучастак і г. д.

Перабудова фактычна ТОЛЬКІ ЗАРАЗ пачынаецца.

Асаблівай увагі заслугоўвае вопыт брыгады ФІЛІЛОВІЧА з заводу імя Варашылава, якая ў выніку пераходу на прэміяльна-прагрэсыўную зьдзельшчыну, што забясьпечвае сапраўднае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, у выніку ліквідацыі абязьлічкі варштатаў пагнала ўверх крывую прадукцыйнасьці працы, дабілася росту на тольні колькасных, але І ЯКАСНЫХ паказальнікаў. Гэты вопыт павінен быць шырока пашырана па прадпрыемствах БССР. Між іншым вельмі зьдзіўляе па меншай меры незразумелая лінія паводзін БЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЯ, якое, чамусьці, забараніла заводу распаўсюджваць на другія брыгады вопыт брыгады Філіповіча. Мы чакаем ад Белмэталяаб'яднаньня дакладных тлумачэньняў па сутнасьці моманту, якія паказаны ў артыкуле «Мэханіка перамогі».

Са ўсёй сілай трэба падкрэсьліць, што ў спосаб перабудовы надзвычай АДСТАЕ МАСАВА - РАСТЛУМАЧАЛЬНАЯ РАБОТА. Куды варта такая пастаноўка растлумачальнай работы, калі, напрыклад, ЛЕПШАЯ брыгада заводу імя Варашылава — Філіповіча ня ведае, у чым канкрэтна сутнасьць пераходу на гаспадарчы разрахунак.

Мы зварачаем АСАБЛІВУЮ ўвагу на пытаньні АРГАНІЗАВАНАЙ ВЯРБОЎКІ І ПАДРЫХТОЎКІ РАБОЧАЙ СІЛЫ. Спадзявацца на самацёк у гэтай справе зараз, ва ўмовах недахвату рабочай сілы — горшы від апартунізму.

Рашуча пакончыць з кіраўніцтвам «наогул». Канкрэтнае кіраўніцтва на аснове прамовы тав. Сталіна забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне бальшавіцкіх пляноў пяцігодкі.

МЭХАНІКА ПЕРАМОГІ

ПЕРШЫ ВОПЫТ ПРЭМІЯЛЬНА-ПРАГРЭСЫЎНАЙ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ НА МЕНСКІМ МАШЫНАБУДАЎНІЧЫМ ЗАВОДЗЕ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА

БЕЗ БЮРАКРАТЫЧНЫХ РАЗВАЖАНЬНЯЎ ПЕРАДАЦЬ ГЭТЫ ВОПЫТ УСІМ ФАБРЫКАМ І ЗАВОДАМ БССР

Колькі можа даць брыгада тав. Філіповіча?

— Ніхто ня ведае, колькі можа даць наша брыгада, —заявіў тав. Філіповіч, і пэрыя вочы яго таямніча прыплюшчыліся.

— Мы сабралі за красавік і май 106 гравіясартовак, гэта значыць па 53 у месяц, а ў чэрвені далі 85 замест 70 паводле прамфінпляну. Колькі гэта будзе процантаў? А? Але гэта глупства, дамо больш.

— У чым сакрэт вашага посьпеху?

— Перабудоўваемся,—весела сказаў тав. Філіповіч.

Сапраўды, за апошнія два месяцы брыгада тав. Філіповіча па зборцы гравіясартовак пачала каранную ломку ўсёй сыстэмы арганізацыі працы і аплаты. Да чэрвеня брыгада тав. Філіповіча (тады яшчэ брыгада Мірскага) працавала, як і рад іншых брыгад,—з глыбокімі прарывамі. Брыгаду разьядзала, як іржа жалеза, абязьлічка варштатаў, непатрэбная зусім у яе ўмовах бесьперапынка, калектыўная зьдзельшчына з яе абязьлічнай зарплатай, адсутнасьць сапраўднага ўдарніцтва і сацспаборніцтва.

Ноты брыгадзір Франц Андрэевіч Філіповіч—радавіты пралетар, нядаўна чорнарабочы (1928 г.), а зараз кваліфікаваны сьлесар, які трэці год зьбірае гравіясартоўкі і вынучыў кожную іх шрубку,—вырашыў з дапамогай парт. і прафарганізатараў удакладніць мэханізм сваёй брыгады паводле чарцяжоў, паказаных у дырэктывах партыі і прафсаюзаў.

Прагрэсыўка ў дзеяньні

Моцны штуршок даў перавод брыгады на прагрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну. Даклад работніка ТНБ аб прагрэсыўцы быў лёгка ўспрыняты і аднагалосна ўхвалены. Праект зводзіўся да наступнага: месячнае заданьне брыгады па прамфінпляне кладае 70 гравіясартовак. За кожную штуку брыгада атрымлівае, згодна расцэнкі, 35 руб. Але даволі брыгадзе сабраць адну лішнюю гравіясартоўку, як брыгада атрымлівае за ўсе 71 машыну ўжо не па 35 руб., а па 35 руб. 10 кап., г. зн. 7 руб. 10 кап. прэміі. Другая машына звыш плану дае яшчэ па 10 кап. на ўсе машыны. Трэцяя дадае яшчэ 10 кап. і г. д. Кожная новая машына звыш пляну павялічвае расцэнку на ўсе машыны на 10 кап.

Перад брыгадай паўстаў новы стымул да падняцьця прадукцыйнасьці—матар'яльная зацікаўленасьць. Ніхто з рабочых брыгады тав. Філіповіча ня гоніцца за капейкай, ніхто з іх не зьяўляецца рвачом. Але ўсе зразумелі, што новая сыстэма аплаты, якая прэміюе рабочага за перавыкананьне пляну, ёсьць у тойжа час магутны сродак для ўзмацненьня сацыялістычнага накапленьня—адзінай базы, якая гарантуе заваяваньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі яшчэ ў бягучым годзе.

Таму зусім правільнай была прапанова рабочага тав. Гермізэ, які першым выступіў на дакладу ТНБ,—дапа посьпеху прагрэсыўкі разгарнуць унутры брыгады сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Група выклікала групу

На гэтай падставе—на падставе сацспаборніцтва і ўдарніцтва і пачалася перабудова арганізацыі працы ў брыгадзе.

Пачала сацспаборніцтва група па заклёпцы рам і карэтак. Выклікала групу па зборцы карэтак. Апошняя выклікала групу па зборцы барабанаў і г. д. Праз дзень-два сацспаборніцтва ахапіла ўсю брыгаду. Кожная група ўзяла на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў, з якіх асноўным было—выканаць заданьне ў 70 гравіясартовак датэрмінова да 25-га чэрвеня.

Брыгада т. Філіповіча. У радзе — тав. Філіповіч.

Праз „папяровую бесьперапынку“

Першай справай парашыні пакончыць з абязьлічнай варштатаў і лепш расставіць рабочую сілу. На дарозе стаяла бесьперапынка. Навошта была патрэбна бесьперапынка ў брыгадзе, якая працавала ў адну зьмену,—ніхто ня ведаў. Проста нашлі на прыкладзе мэханічнага цэху, дзе працуюць тры зьмены і дзе вось ужо восем месяцаў з вялікім посьпехам ўжываецца чатырохкадравы графік, ліквідаваўшы абязьлічку варштатаў.

У адназьменнай брыгадзе бесьперапынка прыводзіла да нябывалай блытаніны. Ніколі брыгадзір загадзя ня ведаў, якую колькасьць людзей ён будзе заўтра мець у сваім распараджэньні. Выходны дзень брыгадзіра пазбаўляў брыгаду камандзіра. Несвалчасовая дастаўка дэталяй павялічвала блытаніну. Калі былі дэталі, ня было поўнага камплекту людзей, былі людзі, не хапала дэталяй. Брыгаду біла ліхаманка. На абязьлічных варштатах працавалі ўсе, хто пажадае. Варштаты часта ламаліся, ніхто іх не даглядаў.

Па ўласнай ініцыятыве брыгада пакончыла з бесьперапынкай, устанавіла адзіны дзень адпачынку (4 працуюць, 5-ты адпачываюць), а каб лепш скарыстаць невыстарчальнае абсталяваньне і плончу ў цэху, каб лепш скарыстаць свае сілы, брыгада перайшла на работу ў дзьве зьмены. Прычым паміж зьменамі ўстаноўлен строгі падзел працы: 2-я зьмена (меншая група) падрыхтоўвае работу, 1-я зьмена (большая група)—канчае яе.

Вытворчыя нарады—у сыстэму

Неабходнасьць у найкарацейшы тэрмін ліквідаваць недахопы выклікала патрэбнасьць у сыстэматычных вытворчых нарадах. Раней вытворчая нарада склікалася раз у два-тры месяцы дый то тады, калі брыгаду пакідалі без дэталяй, калі брыгадзе ня было чаго рабіць.

— Зноў прастой,—крычалі рабочыя,—даеш вытворчую нараду!

Цяпер вытворчыя нарады працуюць, як гадзіньнік. Канец кожнага чацьвертага дня работы перад выходным днём прысьвячаецца вытворчай нарадзе. Зьбіраецца ўся брыгада. Абмяркоўваюць непаладкі, намячаюць мерапрыемствы, як у наступную пяцідзеўку працаваць лепш.

Сыстэматычныя вытворчыя нарады раскрылі рабочым вочы на прычыны пра прываў. Зараз у брыгадзе рыхтуюцца перайсьці на больш высокую ступень — на зьмена - сустрэчны, гэта значыць штодзённыя дзесяцівхвілінныя вытворчыя нарады перад пачаткам работы і прад'яўленьне адзін аднаму, група групе, зьмена зьмене сустрэчных абавязацельстваў.

Новыя мэтады—новыя адносіны да працы

Новыя мэтады работы, правільная арганізацыя працы выклікалі новую хвалю энтузіязму. Адносіны да працы, відныя часта нават у драбніцах, у корані зьмяніліся.

Бывала, калі хто скончыў раней, ён ішоў бадзяцца па заводзе. Зараз, хто канчае работу, сьпяшаецца на дапамогу таварышу, дапамагае выраўноўваць вытворчы фронт, каб ня было затрымань яў з-за гэй ці іншай дэталі.

Раней хвілін ва 5-10 да гудка сьпяшаліся на абед, хавалі інструмант і мылі рукі. Цяпер да гудка ніхто не кранаецца з месца. Наадварот. Пасьля рабочага дня кожны застаецца на некалькі хвілін — заканчвае свой працэс, робіць тую ці іншую прыладу для палягчэньня сваёй работы, ладзіць інструмант.

Раней, калі адзін закурыць, зараз-жа вакол яго зьбіраецца групка з пяці-шасьці чалавек. Зараз лішні раз не закураць. Варта сабрацца двум «курцом», як па брыгадзе нясецца вясёлы крык — «больш аднаго не зьбірайся».

Раней брыгада была месцам спатканьняў. Выходныя прыходзілі на завод — пагутарыць, пакурыць. Зараз, калі да сьлесара Дэвінтэйчыка ў часе работы падыходзіць знаёмы пагутарыць хто-небудзь з рабочых у парадку «добраахвотніцтва» падыходзіць да гэтага знаёмага, дае яму аловак у рукі і раіць запісаць хатні адрас Дэвінтэйчыка і прыйсьці да яго да хаты ўвечары — там больш спрыяючая абстаноўка для гутаркі.

— Вось адкуль у нас 15 машын звыш праграмы, — сьмяецца Філіповіч.

Ня гледзячы на ўсе труднасьці, брыгада дала ў чэрвені рэкордную лічбу — 85 гравіясартовак.

Гэта вынікі прагрэсыўкі плюс тыя мерапрыемствы, якія надалі рабоце брыгады арганізаваны характар.

Заработак пашоў уверх

Што атрымалі рабочыя ад прагрэсыўкі? Апрача чыстай прэміі ў 1 руб. 50 кап. на кожную выпушчаную машыну, што складае на брыгаду 127 руб. 50 кап., брыгада зарабіла, дзякуючы звышпланаваму росту прадукцыйнасьці працы на 21,42 проц., яшчэ 525 руб. (35 руб. ×15 машын). Усяго брыгада атрымала звыш пляну 652 руб. 50 кап. Заработак кожнага рабочага зрабіў рэзкі скачок уверх. Напрыклад, сярэдні дзенны заработак тав. Міклуша складаў у красавіку — маі 3 руб. 71 кап., у чэрвені — 4 руб. 48 кап. (плюс 77 кап.); тав. Гермізэ адпаведна — 3 руб. 56 кап. і 4 руб. 48 кап. (плюс 92 кап.); тав. Філіповіча А. — 3 руб. 15 кап. і 4 руб. 48 кап. (плюс 1 руб. 33 кап.); тав. Пікуса — 3 руб. 17 кап. і 4 руб. 49 кап. (плюс 1 руб. 32 кап.); тав. Філіповіча Ф. — 4 руб. 22 кап. і 5 руб. 31 кап. (плюс 1 руб. 09 кап.); тав. Вараб'я — 4 руб. 24 кап. і 5 руб. 26 кап. (плюс 1 руб. 02 кап.) і г д.

Сабекошт—унія

Сабекошт кожнай машыны ў выніку зьмяншэньня генэральных накладных выдаткаў у сувязі з ростам прадукцыйнасьці зьніжан на 2,74 проц. За вылікам дадатковага выдатку на зарплату, уключаючы прэмію, кожная машына дала заводу дадатковую звышпланавую эканомію ў суме 15 рублёў 39 кап. Гэта эканомія будзе расьці разам з ростам прадукцыйнасьці працы, разам з ростам выпуску машын.

Такім чынам, сыстэма прагрэсыўнай аплаты аказваецца выгоднай і для рабочых і для сацыялістычнага прадпрыемства. Больш таго, прадпрыемства атрымлівае салідны фонд эканоміі накладных выдаткаў, які дазваляе ня толькі павялічыць прэмію за колькасьць, але і ўстанавіць прэмію за якасьць прадукцыі.

Унутраныя рэсурсы—крыніца далейшых перамог

— Ніхто ня ведае, колькі можа даць наша брыгада, — паўтарае тав. Філіповіч.

У брыгадзе далёка не скарыстоўваюцца ўсе ўнутраныя рэсурсы. Зьмена сустрэчных павінен даць магутны штурмок росту прадукцыйнасьці працы. Брыгада яшчэ паняцьця ня мае аб гаспадарчым разрахунку. Ніхто яшчэ не пакпапацюўся аб тым, каб вытлумачыць брыгадзе выгады гаспадарчага разрахунку.

Сыстэма зарплаты ўнутры брыгады патрабуе жадаць лепшага. У брыгадзе існуе яшчэ капентыўная зьдзельшчына, якая ўтойвае ад кожнага рабочага яго штодзённы заработак, скарачае стымул кожнага рабочага да далейшага павышэньня прадукцыйнасьці і кваліфікацыі. Калектыўная зьдзельшчына дае магчымасьць малакваліфікаваным рабочым хавацца за сьпіну кваліфікаваных і пасьля крычаць: «Мы арані». Індывідуальнага ўліку працы няма. Расцэнкі на асобныя працэсы, якія даюць у выніку агульную расцэнку на аборку ўсёй машыны, да кожнага рабочага не даведзены. Некаторыя расцэнкі ўдва паставалі. Удакладненьне расцэнак, даведзеньне іх да кожнага рабочага, індывідуальны ўлік выпрацоўкі і аплата кожнага рабочага па яго выпрацоўцы — вось баявая задача, якая стаіць перад брыгадай і ТНБ.

Ліквідацыя капентыўнай зьдзельшчыны зьявіцца новай крыніцай росту прадукцыйнасьці працы і зарплаты кожнага рабочага.

Тады заява тав. Філіповіча аб тым, што ніхто ня ведае магчымасьцяй брыгады, страціць свой глыбокі сэнс. Прынамсі, сама брыгада і кожны яе ўдзельнік будуць ведаць свае магчымасьці, будуць ведаць, на што яны здольны, і ня будуць плаваць у моры меркаваньняў.

***

Мы тут расказалі аб вопыце пераводу на прагрэсыўку аднэй брыгады заводу імя Варашылава. Гэта, здаецца, амаль адзіны вопыт на БССР. Вопыт аказаўся вельмі ўдалым, прагрэсыўка поўнасьцю сябе апраўдала.

Тым ня менш... вопыт працягваецца. Белмэталяаб'яднаньне забараніла заводу пошырыць гэты вопыт на іншыя брыгады і дазволіла толькі працяг гэтага вопыту ў брыгадзе Філіповіча. У Белмэталяаб'яднаньні ня згодны з сыстэмай прэміяваньня, распрацаванай заводам.

Што датычыць ЦП саюзу, дык да апошняга часу яно наогул стаяла ў баку, а ў апошнія дні, ухваліўшы вопыт заводу імя Варашылава..., зацьвердзіла ў асноўным праект Белмэталяаб'яднаньня. Прафработнікі з ЦП саюзу для палягчэньня сваёй работы (лягчэй паспаць цыркуляр, чым прапрацаваць пытаньне ў кожнай асобнай брыгадзе), параілі абмежавацца бюракратычным «псаўтыром», які павінен, моў, служыць шляхаводнай зоркай для ўсіх брыгад усіх прадпрыемстваў.

Трэба з самага пачатку моцна ўдарыць па бюракратах, якія імкнуцца жывую справу ўвядзеньня прэміяльна-прагрэсыўнай зьдзельшчыны ўпісноуць у рамкі цыркуляра, прыгодзіцца «на ўсе выпадкі жыцьця».

Праўдзін.

П. С. Артыкул гэты быў абмяркован і аднагалосна ўхвален сходам членаў брыгады т. Філіповіча. Папраўкі, прапанаваныя брыгадай, унесены. Брыгада выказала пажаданьне, каб іншыя брыгады, якія перайшлі на прагрэсыўку, падзяліліся вопытам сваёй работы на старонках газэт.

Зроблены першыя крокі

На зав. „Полымя рэвалюцыі“ вялікая цікучасьць рабочай сілы, гаспадарчы разрахунак уведзен толькі фармальна

Прамову тав. Сталіна на заводзе «Полымя рэвалюцыі» (Менск) пачалі прапрацоўваць 10 ліпеня.

Завод да ліпеня ня выходзіў з паласы прарыву. Прамфінплян у красавіку месяцы быў выкананы на 59,2 проц., у маі—на 73,4 проц., у чэрвені—на 68,2 проц.

У ліпені-ж месяцы (пасьля аднаўленьня партыйнага, адміністрацыйнага і прафэсыянальнага кіраўніцтва заводу), у выкананьні прамфінпляну дасягнуў пералом. Па пасажырскім цэху прамфінплян за першую дэкаду выкананы на 73,8 проц., за другую дэкаду на 103,9 проц., па таварным цэху—за першую дэкаду ліпеня—на 116,2 проц. і за другую дэкаду на 106,6 проц. Гэты пералом дасягнуты галоўным чынам у выніку ліквідацыі абязьлічкі, узьняцьця адказнасьці за выконваемую работу, праведзена прымацаваньне рабочых да варштатаў.

Аднак трэба адзначыць, што да гэтага часу не ўстаноўлен улік псаваньняў варштатаў. Цікучасьць рабочай сілы ня спыняецца. Ня гледзячы на тое, што ў прынятай рэзалюцыі пры прапрацоўцы прамовы т. Сталіна значыцца пункт аб выяўленьні вольнай рабочай сілы ў падзяфным калгасе і заключэньні з ім дагавору, ён ня выкананы. На гаспадарчы разрахунак завод пераведзен фармальна. Ён заключаецца толькі ў тым, што начальнікі цэхаў штодзенна зьбіраюць весткі аб выкананьні прамфінпляну кожным рабочым. Балянсаў і лімітаў у цэхах няма.

Рабочыя яшчэ часта скарыстоўваюцца не па сваёй спэцыяльнасьці. Так, сьлесары робяць розныя дробязі ў рамонце, якія з вялікім посьпехам маглі быць выкананы менш кваліфікаванымі рабочымі.

У кожным цэху ёсьць насьценгазэта, але яны нічога не зрабілі для папуляризацыі прамовы тав. Сталіна сярод рабочых сваіх цэхаў.

Зараз завод пераключыўся на рамонт вагонаў для асеньня-зімовых перавозак. Праграма разьлічана на рамонт 800 таварных вагонаў і 1.500 шчытоў для пераводкі збожжа. Гэты рамонт павінен быць праведзен: у ліпені—20 вагонаў, у жніўні—180 і 1.500 хлебных шчытоў, у верасьні і кастрычніку—па 300 вагонаў.

Вакол гэтай праграмы перавозак павінна быць быць мабілізавана ўвага рабочых заводу між тым, ніякай работы ў сувязі з гэтым не праведзена. Ужо зараз наглядаюцца выпадкі прагулаў рабочых і в тае прычыны, што яны сваячасова не атрымліваюць нарадаў на работу. За воджаму камітэту і партыйнай арганізацыі трэба прамову тав. Сталіна пакласьці ў аснову сваёй далейшай работы, чым будзе забясьпечана выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Брыгада «Зьвязды»
МЕЛЕНТОВІЧ і ЭНГЕ.

На фабрыцы „Кастрычнік“—

перабудова толькі у праектах

Зараз-жа пасьля падрукаваньня апошняй прамовы тав. Сталіна, арганізацыі і рабочыя фабрыкі «Кастрычнік» прыступілі да яе прапрацоўкі. Прамова т. Сталіна абмяркоўвалася на нарадзе трыкутніка сумесна з адміністрацыйна-тэхнічнымі пэрсаналам, на цэхавых сходах рабочых. На нарадзе былі створаны брыгады для выпрацоўкі праекту перабудовы па ўсіх пытаньнях, якія былі паказаны ў прамове т. Сталіна.

Новая сыстэма аплаты забясьпечыла рост прадукцыйнасьці працы

Праект па ліквідацыі ўраўнілаўкі, які выпрацавала брыгада па пытаньні зарплаты, быў надрукован на шклографе і разданы кожнаму рабочаму. Пасьля гэтага праект абмяркоўваўся на цэхавых сходах рабочых і агульным сходзе калектыву. Новая сыстэма аплаты нанесіць сьмяротны ўдар па ўраўнілаўцы, якая панаполна панавала дагэтуль на фабрыцы «Кастрычнік».

Пры канвэерай сыстэме вытворчасьці ўлік і аплата працы праводзіліся раней па апошняй апэрацыі ў істужцы. Гэта сыстэма прыводзіла да абязьлічкі ў працы і ўраўнілаўкі ў аплаце. Уліку перабрак браку і якасьці работы ня было.

Новая сыстэма уліку і аплаты пабудована на прынцыпе прагрэсыўна-прэміяльнай зьдзельшчыны. Уся істужка разьбіваецца на 10—12 брыгад па 6—8 чалавек. Кожная брыгада вырабляе якую-небудзь дэталь. Улік і аплата працы ў брыгадзе праводзяцца па сыстэме апошняй рукі ў брыгадзе. Паасобныя апэрацыі, якіх нельга дапасаваць да брыгады, улічваюцца і аплачваюцца індывідуальна. Апэрацыі, нагружаная звыш сярэдняга (якая перавышае сярэдні рытм), адпаведна вышэй аплачваецца. Для стымуляваньня росту прадукцыйнасьці працы ўнутры брыгады ў карысьць брыгады ўлічваецца аплата з таго таварыша, які сыстэматычна ня выконвае нормы. Старшы брыгадзір сумесна з інструктарам вядуць улік колькасьці і якасьці работы брыгады і асобнага ўдзельніка яе.

Пры перавыкананьні брыгадай пляновага заданьня ўстанаўляецца прэмія: за 5 проц. перавышэньня заданьня выплачваецца звыш расцэнкі 15 проц., ад 6 да 10 проц. перавыкананьня—20 проц., ад 11 проц. і вышэй—30 проц. Апрача таго ўстанаўляецца пасьлядоўны ўзаемны кантроль над якасьцю. За кантроль над якасьцю адказвае апошняя рука ў брыгадзе.

Для адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу таксама ўстанаўляецца прэмія за перавыкананьне пляну.

Гэта сыстэма, ствараючы ўмовы для найбольшага разгортваньня спаборніцтва і ўдарніцтва ўнутры брыгады і паміж брыгадамі, адначасова стымулюе узьняцьце прадукцыйнасьці і інтэнсыўнасьці працы і палепшэньня якасьці прадукцыі. Два паасобныя цэхі, склад сырцу і склад гатовага адзеньня ўжо пераведзены на новую сыстэму аплаты. І выніку зараз-жа праявіліся. Склад сырцу ўзьняў прадукцыйнасьць працы на 71 проц., зар- [illegible] на 30 проц., зарплата на 72 проц., зьнізіў сабекошт на 17 проц. і павялічылася зарплата на 30,2 проц. На жаль, тэмпы ліквідацыі ўраўнілаўкі ў асноўных вытворчых цэхах адстаюць. Новая сыстэма аплаты ўводзіцца там толькі з 1-га жніўня.

Па кожнай істужцы вылучаны і працуюць брыгады па выяўленьні і вывучэньні выпадкаў разьбежкі паміж кваліфікацыяй і аплатай рабочых.

Ліквідацыя абязьлічкі—яшчэ не пачата

Па пытаньні ліквідацыі абязьлічкі ў абсталяваньні і адміністрацыйным кіраўніцтве, якая (абязьлічка) і дагэтуль яшчэ «здравствует» на «Кастрычніку» і моцна адбіваецца на выкананьні прамфінпляну, адпаведнай брыгадай выпрацаван праект. Для ўдасканаленьня асобных момантаў праекту абвешчан конкурс на лепшыя рабочыя прапановы па гэтым пытаньні. Устаноўлены 3 прэміі ў 100, 175 і 250 руб. Разгортваецца работа па прыцягненьні рабочых да ўдзелу ў конкурсе (лістоўкі, плякаты і г. д.).

Чырвонасьцяжны «Кастрычнік» у 1932 г. павінен больш чым у два разы падвоіць свае рады. Старыя крыніцы рабсілы для прэвіднай прамысловасьці—самаўтужнікі гарадоў і мястэчак—вычарпаны. Рабочыя «Кастрычніка» намячаюць канкрэтныя мерапрыемствы для практычнага ажыцьцяўленьня ўказаньняў таварыша Сталіна аб арганізацыі прытоку рабочай сілы.

Белшэйлаб'яднаньне павінна заключыць дагавор з жанчынамі гораду. Швэйлаб'яднаньне бярэ на сабе абавязак падрыхтаваць з жонак і дзяцей рабочых праз сыстэму школ масавых прафэсій адпаведную колькасьць кваліфікаваных кадраў рабочых. Жаньтдэл павінны даць памяшканьне і дапамагчы ў арганізацыі ўстаноў сацыяльна-бытавога абслугоўваньня рабочых (сталовыя, яслі, дзіцячыя сады і г. д.).

Палепшыць матар'яльна-бытавое абслугоўваньне

Матар'яльна-бытавое абслугоўваньне рабочых—самае вузкае месца «Кастрычніка». 56 проц. агульнага ліку рабочых складаюць жанчыны. Між тым, яслі пры фабрыцы могуць абслужыць усяго 40 дзяцей. Ня дзіва пасьля гэтага, што другі квартал 31 году паказвае значны ўзрост цікучасьці рабочае сілы. Фабрыку кінула каля 400 рабочых, з якіх пераважная колькасьць жанчын. Пры фабрыцы будуюцца новыя яслі і сталовая. Але «намаганьнямі» Менканторы Белдзяржбуду скончэньне пабудоў сарвана, ня гледзячы на тое, што асноўная работа па будаўніцтве праведзена.

Скончэньне сталоўкі і яслей забясьпечыла-б значнае палянёньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых і ліквідавала-б нагрозу далейшага адыходу работніц.

Для «Кастрычніка», які налічвае зараз 56 проц. жанчын і які павялічвае свае рады ў 1932 годзе на 2.000 чалавек, з якіх пераважная колькасьць будуць працоўныя жанчыны, — арганізацыя прафсаюзаў першачарговай задачай. Гэта пытаньне пасьпяховага выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. На жаль, яно зусім выпала з увагі фабрычных арганізацый. Неабходна зараз-жа ўжыць канкрэтныя крокі для вырашэньня яго.

Партарганізацыя чырвонасьцяжнага «Кастрычніка» на чале ўсяго рабочага калектыву, ня раз паказваючы адольнасьць пераможна змагацца за генэральную лінію партыі, вырашыць фронт барацьбы за прамфінпляны, будзе ўдарна змагацца за ажыцьцяўленьне ўказаньняў, якія даны ў прамове правадыра партыі т. Сталіна.

Брыгада «Зьвязды»
РОХКІНД, МЭРОВІЧ, ФРАДЗІН, ПІКУС.

Камуна сьвідравальшчыкаў (зав. «Камунар») абгаварвае пытаньне аб ліквідацыі абязьлічкі варштатаў.

Тры забытых вучасткі на Гомсельмашы

1. У чым прычына цікучасьці рабочай сілы?

Бадай на кожным перапынку рабочыя ідуць у заўком, у цэхкомы.

—Ну, як, можа вырашыў?

—Яшчэ нічога ня чуваць?

—Хоць бы які куток далі.

Заўком і цэхкомы і адміністрацыя адказваюць толькі паціскальнем плеч. Рабочыя, або спрачаюцца, або адыходзяць, грызучы зашмальцаваны недакурак папяросы.

—У чым-жа справа?

Справа ў тым, што з 1500 сельмашаўскіх рабочых—каля 500 чалавек ня мае кватэр, або жыве ў самых дрэнных умовах.

Некаторыя жывуць гуртамі на прыватных кватэрах, маючы толькі дзе пасьпаць; некаторыя езьдзяць ажно па 20 кілёмэтраў да хаты, у вёскі і некаторыя перабіваюцца «бяспрытульнымі» па знаёмых; у некаторых ёсьць сем'і, якія жывуць асобна па году і больш у Віцебску, у Воршы і ў іншых гарадох, і яны ня могуць іх забраць да сябе, каб і спакойней працаваць і больш эканомна жыць.

Жыльлёвыя ўмовы—надзвычайна вострае пытаньне для Сельмашу. Яно набывае яшчэ больш актуальны характар у сувязі з павялічэньнем вытворчай праграмы заводу, у сувязі з ліквідацыяй запазычанасьці перад краінаю, у сувязі з ростам Сельмашу, з павялічэньнем колькасьці рабочай сілы. Калі ў ранейшых карэспандэнцыях брыгады «Зьвязды» гаварылася пра цікучасьць рабочай сілы, дык прычыны гэтай цікучасьці ў значнай ступені залежаць ад жыльлёвых умоў. Былі выпадкі, калі па прычыне адсутнасьці жыльля Гомсельмаш пакідалі рабочыя-цэлымі партыямі. Завод пакідалі высокакваліфікаваныя рабочыя.

Як-жа стаіць справа жыльлёвага будаўніцтва на Гомсельмашы?

Будуецца 80-кватэрны дом. Дом павінен быў быць закончаны да мая сёлетняга году. Белдзяржбуд дагавору ня выканаў. Дагавор алтэрміноўваўся да чэрвеня, пасьля да ліпеня, але дом ня скончаны, і... хто ведае, ці будзе гатовы праз тры месяцы.

У Белдзяржбудзе не хапае цэлага раду будаўнічых матар'ялаў. Каб паскорыць будаўніцтва, Белдзяржбуд зьвярнуўся да Сельмашу з просьбаю мабілізаваць патрэбныя заводзкія рэсурсы на дапамогу жыльлёваму будаўніцтву. На Сельмашы створана спэцыяльная камісія садзейнасьці будаўніцтву. Камісія вынесла рад пажаданьняў і пастаноў. Пастанова і пажаданьні засталіся на паперы. Прафарганізацыя, заўком здаволены тым, што канцылярыя мае сабе памяшканьне, і пытаньнем жыльлёвага будаўніцтва ня цікавяцца.

У пляне будаўніцтва на 1931 г. прадугледжана пабудова другога дому, але для пабудовы яго ня толькі не закладзен фундамант, а нават нічога не падрыхтавана.

Разьмеры гэтага будаўніцтва нават пры больш шпаркіх тэмпах разгортваньня ня вырашаюць жыльлёвай праблемы. Заводакіраўніцтву Гомсельмашу трэба знайсьці больш рэальны выхад, тым больш, што вырашэньне гэтай праблемы дапамагае палёпшыць памяшканьняў, якія патрабуюць некаторага пераабсталяваньня. Каля заводу стаяць кашары ваеннаму, адкуленыя Гомсельмашам на знос. З гэтых кашараў, пры зусім пязначнай затраце сродкаў можна было зрабіць летнія кватэры. Зацяжка-ж капітальнага жыльлёвага будаўніцтва стаіць рубам перад заводакіраўніцтвам Сельмашу пытаньне пра мэтазгоднасьць скарыстаньня гэтых кашараў і на зімовы час.

2. „Культурная“ цішыня, ці культурная рэвалюцыя?

У пляне будаўніцтва Сельмашу не прадугледжана пабудова ні клюбу, ні бібліятэкі, ні чытальні, ні куткоў. Гэта бязумоўна, вялікі недагляд, які адбіваецца на стане культмасавае работы на Сельмашы. Але гэта ні ў якім разе ня можа даваць права спасылацца на «адсутнасьць» месца і адсоўваць гэтую работу на задні плян, чакаючы спэцыяльных пакояў.

А гэты фронт работы на Сельмашы—на заднім плане. Ні чырвоных куткоў, ні чытальні, ні бібліятэкі, ні культмасавай работы на Сельмашы няма. Пры заўкоме нават няма культработніка.

Былі нясьмелыя пачынаньні і ад гэтых пачынаньняў засталася толькі назва «бібліятэка». У малюсенькай шафцы ляжыць сотня-паўтары кніжак і толькі штук 10 такіх, якія ходзяць цедае па руках. Але-ж чытаць няма чаго. Ноныя кнігі не закуплёваюцца. Бібліятэка абслугоўваецца ў парадку грамадзкай нагрузкі. 2.000 руб. адпушчаных на бібліятэку, скарыстана толькі каля 400 руб.

Зусім дрэнна з культурным абслугоўваньнем рабочых у цэхах у часе перапынку. Цэхавых чыталеньняў няма. Ні газэт, ні часопісяй ня выпісана. Замест таго, каб у часе перапынку вольны час скарыстаць культурна, рабочыя яго раскурваюць.

З усіх гурткоў працуюць толькі 6 па вывучэньні тэхнікі і 1 па вывучэньні беларускай мовы. Драматычны гурток распаўся, музычны—ледзь ліпіць, радыё—раскрадзе,—вось такою «бурнаю» культурнаю рэвалюцыяй жыве Сельмаш, нават ня ведаючы, ці ёсьць—а калі ёсьць, дык колькі—нянісьменных на заводзе. Поўная «культурная» цішыня і спакой. Ніякіх вечароў, ніякай культмасавай работы рабочыя Сельмашу ня ведаюць. І нават выязджаў за горад, масавак, якія ў летні час не патрабуюць памяшканьня — таксама амаль няма, апрача некалькіх... спроб мэханічнага цэху. На работы па розных сэкцыях Сельмашу адпушчана 13.300 руб., з якіх сакрыстана толькі 4.314 руб. З 1.000 руб., адпушчаных на такую важную галіну работы, як культвочая асьвета—не скарыстана ні рубля. Ня дзіва, што з-за адсутнасьці культурнага скарыстаньня час

Год выданьня—XV
№ 204 (4109)
ЧАЦЬВЕР 30, ЛІПЕНЯ 1931
Цана нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны
рэдактар—4-27,)—сакратар—10-74, партсэкстар—13-80, прамысл.—13-80, сац. земл.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-42, міжгародняй інфармацыі—10-74, канторавыд-ва—7-81, адд. з. абестак—7-81

Крывавыя оргіі ў турмах фашысцкай Польшчы

Яшчэ адна ахвяра польскай дэфэнзывы

Павешан член ТБШ, селянін Ф. Марчук

У канцы мая, у вёсцы Воўкавічы, Навагрудзкага ваяводзтва, **паліцэйскімі агентамі дыфэнзывы павешан член таварыства беларускай школы — селянін Фёдар Марчук.**

Яшчэ адна ахвяра фашысцкіх злачынцаў польскіх акупантаў. Забіт селянін, які актыўна працаваў у легальнай нацыянальна - культурнай арганізацыі. Адзіным яго «злачынствам» было тое, што ён актыўна змагаўся супроць нацыянальнага гнёту, за нацыянальнае вызваленьне свайго народу. Ён са дня ў дзень арганізоўваў сялян сваёй вёскі для гэтай цяжкай, упорнай і слаўнай барацьбы.

Фёдар Марчук у гэтай сваёй штодзённай рабоце ня ішоў ні на якія зьдзелкі з акупантамі і іх вернымі слугамі—беларускімі нацыянал-фашыстамі. Ён ведаў, што шлях да вызваленьня яго прыгнечанага народу ляжыць не праз згоду з ворагамі і прыгнятальнікамі, а **праз непрымірымую барацьбу мас за свае правы і інтарэсы.** Ён ведаў, што імёны ідучы па гэтых шляхох, яго свабодныя браты ў Савецкай Беларусі змогуць будаваць новае жыцьцё, новае грамадзтва, сваю родную пралетарскую культуру. У тым, што робіцца ў вызваленай Савецкай Беларусі, ён бачыў канчатковую мэту сваёй барацьбы.

Фёдар Марчук адзін з многіх. Ён толькі зьяўляецца найбольш тыповым прадстаўніком гэтай шматмільённай масы беларускага народу, якая дзень за днём ва ўпартых баёх змагаецца супроць імпэрыялістычнага гнёту польскіх акупантаў. Ён толькі яркі асколак таго вялікага руху шырэйшых народных мас Заходняй Беларусі, які на працягу год цяжкай барацьбы змог радзіць не адну сотню такіх-жа няпрыкметных, але выдатных гэрояў нацыянальна-вызваленчага руху.

І таму, што Марчук ня гнуў паслушна сьпіну перад акупанцкім бізуном, ён быў забіт фашыстамі. **Зьверская расправа над ім, учыненая агентамі дэфэнзывы, зьяўляецца толькі яркім паказчыкам таго тэрору, таго рэжыму разгулу, які панує на акупаваных землях Заходняй Беларусі.**

Забойства селяніна Марчука не паслабіць радоў нацыянальна - вызваленчага руху. Ён будзе расьці і шырыцца, рыхтуючыся разам з пралетарыятам усёй Польшчы да рашаючых баёў супроць гнёту і эксплёатацыі.

Памяці Фёдара Марчука—наша рэвалюцыйная пралетарская слава.

Ш.

Вываз палітзьняволеных з Лукішак у Вронкі

З апошніх падзей на Лукішках

Прашло ўжо паўтары тыдні, як скончылася **9-дзённая галадоўка палітычных зьняволеных Лукіскай турмы.** Пры якіх умовах скончылася гэта галадоўка? На 8-мы дзён у турму зьявіліся памочнік пракурора і памочнік начальніка турмы, заявіўшы, што ў сувязі з адсутнасьцю пракурора і самога начальніка, яны ўпаўнаважаны наведаміць палітзьняволеным, што адміністрацыя зьверне ім бібліятэку, згаджаецца прызнаць камуну зьняволеных і г. д.

У рэзультаце гэтай заявы палітзьняволеныя спынілі галадоўку. Як выявілася праз два дні, **заява пракуратуры і турэмнай адміністрацыі зьявілася толькі манэўрам. У турму прышлі пракурор і начальнік, заявіўшы аб тым, што ні аб якіх уступках ня можа быць і мовы.**

Больш таго, **па распараджэньні пракурора, турэмная адміністрацыя пачала вывозіць з Лукішак найбольш перадавых і актыўных палітзьняволеных.** Агульнае становішча ў турме **ўсё пагаршаецца.**

Настрой сярод палітзьняволеных застаецца напружаным. Таварышы рыхтуюцца да новай барацьбы, да новага выступленьня. На злосны манэўр ворага палітзьняволеныя Лукішак адказваюць умацаваньнем арганізаванасьці сваіх радоў і павышэньнем гатоўнасьці да працягваньня ўпартай барацьбы.

Палітзьняволеныя натхнёны тым фактам, што **іх барацьба знайшла найшырэйшы водгук у пралетараў Вільні.** У часе галадоўкі, як вядома, адбывалася некалькі баявых дэманстрацый у Вільні, адна з іх каля самай турмы. На радзе рабочых сходаў прымаліся рэзалюцыі пратэсту. Павялічыліся рады Мопру, які набывае шырокую папулярнасьць сярод віленскіх працоўных. Усе дні галадоўкі працоўная частка гораду жыла пад уражаньнем галадоўкі, прыглядаючы ўсю сілу для таго, каб дапамагчы братом, якія змагаюцца.

Правакацыі і ашуканства адміністрацыі выклікалі хвалю абурэньня сярод рабочых Вільні. Рабочыя і палітзьняволеныя разам, у цесным саюзе, рыхтуюцца да новых выступленьняў супроць тэрару.

ВЕСТКІ З ПІНСКАЙ ТУРМЫ

Мы адзначылі нядаўна аб надзвычайным пагоршаньні становішча палітзьняволеных унутры польскіх турмаў. Галадоўка ў Лукішках кінула яркае сьвятло на тыя адносіны, якія ўстанаўляюцца фашысцкай турэмнай адміністрацыяй у каменных мяшкох Польшчы.

За апошні час усё больш трывожныя весткі прыходзяць з-за крат **Пінскай турмы. Не так даўно там праходзіла галадоўка 80 палітычных зьняволеных.** У рэзультаце галадоўкі фашысцкая адміністрацыя турмы яшчэ больш зьверскі пачала трактаваць пінскіх палітзьняволеных.

Паводле даных усе 80 палітзьняволеных **пераапранутых ўжо ў вопратку крымінальных злачынцаў. Усе зьняволеныя ў прымусовым парадку астрыжаны,** так як гэта робіцца з крымінальнымі злачынцамі. **У палітычных — адміністрацыя адабрала бібліятэку, права дзеляжу прадуктаў,** якія атрымліваюцца са сваводы, **скараціла прагулку і спатканьні са сваякамі.**

Але ўсяго гэтага, аказваецца, мала, для турэмнай адміністрацыі. Начальнік турмы—былы інспэктар вядомай цяжкай катаргі на Сьвентакрыскай гары, па прозьвішчы **Колец, зьяўляецца садыстам у літаральным сэнсе гэтага слова.** Усё часьцей над кіраўніцтвам гэтага Конца ў Пінскай турме адбываюцца арганізаваныя ім напады паасобных падкупленых крымінальных злачынцаў на палітычных зьняволеных. Ня так даўно **банда паліцэйскіх і шпікоў уварвалася ў камэры палітычных і да крыві зьбіла апошніх. Ёсьць шмат параненых і цяжка зьбітых.** Зусім відавочна, што ўсе гэтыя крывавыя гэраічныя ўчынкі начальніка Пінскай турмы Конца застаюцца **без пакараньня.** І гэта ня дзіўна, бо таксама як Лукішкі, таксама як Луцк — і Пінск **зьяўляецца ня выключэньнем, а сыстэмай у краіне пануючай фашысцкай дыктатуры.**

Злачынствы турэмнай адміністрацыі ў Пінску выклікаюць усё большае абурэньне і пратэст з боку пралетараў Пінску і сялян усёй Піншчыны. Працоўныя са свабоды рыхтуюцца да магутных выступленьняў супроць крывавых злачынстваў Конца, супроць фашысцкіх акупантаў.

1001 здрадніцтва сац. фашыстаў

Гэраічная забастоўка францускіх тэкстыльшчыкаў сарвана

ПАРЫЖ, 28. Як паведамляе «Юманітэ», на агульных сходах бастуючых тэкстыльшчыкаў у Аллюене, у Холмне і Вэрвіку на прапанове франка-бэльгійскага забастовачнага камітэту, ухвалены рэзалюцыі аб аднаўленьні работы 29-га ліпеня. У рэзалюцыях забастоўшчыкі кляймяць здрадніцкую рэфармісцкіх і каталіцкіх прафсаюзаў і заяўляюць, што яны прыступяць да работы згуртаванымі масамі, аднак, не 28, як патрабуюць прадпрыемцы, а 29-га, каб гэтым прадэманстраваць свой пратэст супроць **здрадніцкай згоды** .Забастоўшчыкі паказваюць, што яны будуць працягваць пад кіраўніцтвам гэтага-ж самага забастовачнага камітэту барацьбу на самых прадпрыемствах за аднаўленьне зарплаты ў ранейшых разьмерах; гэта барацьба будзе весьціся пры дапамозе камітэтаў барацьбы, што ствараюцца на прадпрыемствах, і замацаваньня адзінага рабочага фронту. «Юманітэ» адзначае зьмяншэньне ўплыву рэфармісцкіх правадыроў сярод рабочых, якія далучаюцца да рэфармісцкіх прафсаюзаў.

Перад новай генэральнай бойкай у Кітаі

Карная экспэдыцыя супроць Нанкіна

ТОКІЙ, 25. **Па вестках з Кітаю, кантонскі ўрад апублікаваў дэкларацыю аб пачатку карнай экспэдыцыі супроць Нанкіна. 4 групы кантонскіх войск атрымалі загад пачаць наступленьне на Хунан.**

***

ШАНХАЙ, 28. У ангельскай газэце зьмешчана дэкларацыя члена кантонскага ўраду, сына Сун Ян-сена, у якой гаворыцца: «на працягу месяца ваеннаначальнікі, якія знаходзяцца пад камандай Фыш Юй-сяна і Ен Сі-шана, выступяць разам з намі супроц. Чан Кай-шы».

Фізкультурнікі—да міжнароднага чырвонага дня

Менскі гарадзкі савет фізкультуры распрацаваў плян сьвяткаваньня Міжнароднага чырвонага дня. Сьвята праводзіцца пад лёзунгам актыўнага ўдзелу фізкультурнікаў у абароне СССР. У пабудове грамадзянскай авіяцыі і іншае.

У гуртках праводзяцца 10-хвілінныя гутаркі аб значэньні МЧД. Арганізоўваюцца платныя вечары на карысьць грамадзянскай авіяцыі. 1 жніўня на ўсебеларускім стадыёне адбудзецца агульна-гарадзкі зьлёт фізкультурнікаў Менску.

Рэдакцыям усіх раённых газэт

Адзначаем нездавальняючую работу пераважнай часткі раённых газэт па ўключэньні ў абвешчаны ЦО КП(б)Б — газэтаю «Зьвязда» месячнік генэральнай праверкі і самаправеркі падрыхтаванасьці да ўборачнай кампаніі. Абавязваем безадкладна ўключыцца ў правядзеньне месячніка, завастрыць на гэтым пытаньні асаблівую ўвагу, разгарнуць шырокую масава-апэрацыйную работу, мабілізаваць увагу ўсёй пралетарскай грамадзкасьці. Работа па прапрацоўцы пастаноў 2-га ўсебеларускага зьезду рабсельвасакораў павінна самым непасрэдным чынам арганічна зьвязвацца з яшчэ большай мабілізацыяй усяго нізавога друку і мас рабселькораў на выкананьне задач уборачнай кампаніі. Гарадзкія газэты павінны з нумару ў нумар арганізоўваць генэральную праверку падрыхтаванасьці да ўборачнай кампаніі прадпрыемстваў, якія шэфствуюць над калгасамі, а таксама рабіць праверку падрыхтаванасьці да ўборачнай кампаніі тых прадпрыемстваў, якія вырабляюць або рамантуюць сельска-гаспадарчыя машыны.

ПАДКРЭСЬЛІВАЕМ, ШТО СПРАВЕ МАБІЛІЗАЦЫІ ПРАЗ ДРУК УВАГІ ЎСЁЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ ДА ПЫТАНЬНЯЎ ЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ НАДАЕМ ВЯЛІЗАРНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ. Праз дэкаду на старонках газэты «Зьвязда» будзе зьмешчан агляд раённых і цэнтральных газэт па адзначаных вышэй пытаньнях.

Загадчык Культпропу ЦК КП(б)Б
ЧАРНУШЭВІЧ.

Заг. сэктару друку Культпропу
ЦК КП(б)Б
КУРЦІК.

„Вы будуеце сацыялізм, мы руйнуем капіталізм"

Нічога «замежнага» на першы погляд на іх ня відаць. Таяж вопратка, якую носяць нашы рабочыя — кашуля касаворотка, простыя брукі, рабочая кепка. Толькі мова крыху адрозьніваецца ад нашай.

Гэта чарговая дэлегацыя рабочых Чэха-Славакіі прыехала для таго, каб наглядзець і вывучаць наша разгорнутае бальшавіцкімі тэмпамі сацыялістычнае будаўніцтва.

Новы запас праўды прыехалі яны перапаць з крыцін энтузіязму рабочае клясы СССР, каб фактамі і лічбамі заліць мора паклёпаў, якім са старонак сацыял-фашысцкага друку сацыял-інтэрвэнты стараюцца зацямніць розум яшчэ нежадаючай кампартыйнай часткі рабочае клясы.

Аглядаюць цэхі чырвонасьцяжнага заводу «Камунар». Сярод гасцей дэлегацыі ёсьць сьлёсары, токары. Іх вопытнае вока адразу заўважае непаладкі ў рабоце. Чаму разьцы ня вострыя? — пытаецца адзін член дэлегацыі. І тутжа сам знаходзіць адказ. Рабочыя яшчэ мала кваліфікаваны.

На мітынгу ў ліцейным цэху член дэлегацыі ўсхваляўна гаворыць:

«У вас недахват кваліфікаваных кадраў, вы прымушаны ставіць некваліфікаваных рабочых на кваліфікаваную працу. Беспрацоўе ў вас ліквідавана. а ў нас сотні тысяч кваліфікаваных рабочых бяз працы і паміраюць з голаду. Вы адкрываеце ўсё новыя і новыя заводы, а ў нас усё больш і больш закрываюцца тыя, якія ўжо ёсьць. У вас яшчэ шмат непаладкаў. Але мы ведаем, што вы зьнішчыце свае недахопы, а блыскучая рацыяналізацыя капіталістычных краін нічога ня варта. **Вы будуеце сацыялізм, мы руйнуем капіталізм».**

У бляшаным цэху зноў мітынг. Член дэлегацыі расказвае: **«Чэха-Славакія стала арсэналам для будучага ваеннага нападу на СССР.** Ня гледзячы на глыбокі эканамічны крызіс, **ваенная прамысловасьць разьвіваецца ліхаманкавымі тэмпамі. Наша задача — задача ўсяго пралетарыяту капіталістычных краін пад рыхтавацца так, каб у любы момант выступіць на абарону СССР. А вайну імпэрыялістычную мы ператворым у вайну грамадзянскую».**

Дэлегацыя аглядае новы цэх заводу, якога ні адно капіталістычнае прадпрыемства ня мае — сталоўку. Садзяцца абедаць, а пасьля тут-жа ў сталоўцы яшчэ адзін мітынг. Скончыўся мітынг, члены дэлегацыі зацягваюць бадзёрымі галасамі песьню «Чырвоны сьцяг». А потым доўгая гутарка са старшынёю заўкому, з намесьнікам дыректара заводу і сакратаром парткалектыву.

Іх цікавіць усё найменшае з жыцьця і быту савецкага рабочага.

Малады рабочы-вылучэнец, намесьнік дыректара заводу тав. **Грыб** расказвае гісторыю аб'яднаньня трох маленькіх прадпрыемстваў у адзін магутны завод — «Камунар».

— Колькі вам год? — раптам пытае адзін член дэлегацыі ў тав. Грыба.

— Дваццаць чатыры! — адказвае той весяла.

— А колькі атрымлівае дыректар пэнсіі?

— Дзьвесьце пяцьдзесят рублёў.

Зьдзіўлена дэлегацыя і пэнсіяй дыректара, і моладасьцю яго намесьніка, як, наогул, зьдзіўлена нябачанымі тэмпамі будаўніцтва маладой нашай сацыялістычнай краіны.

Цывес.

Ударнай уборкай ільну і канапель--замацуем посьпехі веснавой сяўбы

На нарадзе пры рэдакцыі „Зьвязды"

28 ліпеня пры рэдакцыі газэты «Зьвязда» адбылася нарада цэнтральных арганізацый і ўстаноў па пытаньнях ходу падрыхтоўкі да ўборкі і апрацоўкі ільну і канапель.

Уступны даклад зрабіў прадстаўнік Галоўленкому СССР тав. **Айзенсон.** У сваёй прамове ён завастрыў увагу ўдзельнікаў нарады на неабходнасьць поўнага збору ўсяго ўраджаю ільну і канапель, сваячасовай яго апрацоўкі і поўнага выкананьня плянаў загатовак.

Як-жа падрыхтаваліся цэнтральныя арганізацыі і ўстановы да ўборкі тэхкультур? Як перабудавалі яны сваю работу і кіруюць нізавымі арганізацыямі?

Адказ на гэтыя пытаньні даюць інфармацыі і спрэчкі, якія выявілі вельмі сумныя малюнак.

КАЛГАСЦЭНТР БССР.

У ліпені праведзена ўсебеларуская нарада брыгадзіраў-ударнікаў ільнаканапляводчых калгасаў, дзе былі абмяркованы пытаньні, зьвязаныя з уборачнай кампаніяй. Як быццам-бы для пачатку добра. Аднак, у далейшай рабоце патрэбных тэмпаў ня было ўзята. Зусім правільна крытыкавалі ўдзельнікі нарады безадказьнейшае затрыманьне ў канцэлярыях Белкалгасцэнтру рабочай праграмы ўборачных работ. Толькі 26 ліпеня рабочая праграма была адпраўлена Райкалгасаюзам. Як залвіў член праўленьня Белкалгасцэнтру тав. **Шнурдзе,** затрымка з рассылкай рабочых праграм выклікана... адсутнасьцю сродкаў у суме **1.000** рублёў.

Пад сушылкі ільну трэба прыстасаваць старыя хлявы і пуні. Аднак, нічога ня робіцца ў справе выкананьня пастановы Наркамзему аб арганізацыі **400** ільна-мяльна-сушыльных пунктаў, з прыстасаваньнем хлявоў і пунь. Замест практычнай праверкі выкананьня дырэктыў, Белкалгасцэнтр абмежаваўся цыркулярамі.

Як Белкалгасцэнтр, так і Трактарацэнтр ня ўжылі мер, каб забясьпечыць увядзеньне зьдзельшчыны і наладзіць яе ўлік па ўсіх відах уборачных работ.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ТРАКТАРАЦЭНТРУ.

Па падліках Трактарацэнтру неабходна падрыхтаваць **1.532** рабочых для працы на машынах у часе ўборкі тэхкультур. Як ідзе падрыхтоўка кадраў? Колькі асоб набыло кваліфікацыю?—Прадстаўніку Трактарацэнтру тав. **Брандабоўскаму** — невядома.

Па калгасах, якія абслугоўваюць МТС, патрэбна ўбраць **39.590** гэкт. ільну і канапель. Пасьпяховае правядзеньне ўборкі залежыць ад правільнай расстаноўкі і скарыстаньня рабочай сілы. У МТС, як і ў Трактарацэнтры ёсьць прыгожыя вялікія пляны ўборкі тэхкультур. Аднак, МТС ня сталі яшчэ арганізатарамі правільнай расстаноўкі і скарыстаньня рабочай сілы, а Трактарацэнтр не праверыў сапраўднага выкананьня складзеных плянаў.

НАРКАМЗЕМ.

Зусім дрэнна наладжана разьмеркаваньне ільнаапрацоўчых машын. Ільнаводчыя раёны, якія павінны атрымаць машыны ў першую чаргу, на справе атрымліваюць у апошнюю. Частка раёнаў не жадае... прымаць ільнамялак.

Наркамзем не забясьпечыў выкананьня плянаў падрыхтоўкі кадраў. Замест **5.000** брыгадзіраў-ільнаводаў, падрыхтавана толькі... **578.**

Белсампрамсаюз зрывае выраб **800** малатарань **«Эддзі»,** — малатарні да гэмалатарань сыстэмы «Эддзі» можна наладзіць з вялікім посьпехам на мясладзіць з вялікім посьпехам на мясцах. Аднак, у радзе раёнаў не жадаюць гэтым займацца і ў апраўданьне шукаюць аб'ектыўных прычын.

Наркамзем павінен зараз-жа наладзіць канкрэтнае і выстарчальнае жывое кіраўніцтва раёнамі, якое-б забясьпечыла пасьпяховае правядзеньне ўборкі тэхкультур.

БЕЛІЛЬНАКАНАПЛЯБУД.

Да пуску ільназаводаў застаюцца 2—2 з пал. месяцы. Аднак, сёньняшні тэмпы ствараюць простую пагрозу зрыву будаўніцтва. Пляны будаўніцтва заводаў выкананы толькі на 25,5 проц., прычым заводы, якія павінны быць пушчаны ў першую чаргу, пабудаваны толькі на 35,5 проц. Тормазам у будаўніцтве заводаў першай чаргі зьяўляецца недахват будаўнічых матар'ялаў — толі, цьвікоў і інш. Аднак, галоўная бяда ў тым, што наяўныя будматар'ялы разьмяркоўваюцца Белільнаканаплябудам бяз усякага пляну. У выніку — ёсьць рад выпадкаў, калі больш забясьпечаны будматар'ялкамі заводы трэцяй чаргі, чымся заводы першай чаргі. У Межанскім раёне на ільназавод прыбывае абсталяваньне, тальнады, калі памяшканьне толькі пачынаюць будаваць.

Заводы Белільнаканаплябуду сваячаснае становішча з рабочай сілай.

БЕЛІЛЬНААПРАЦОЎКА.

Гэта арганізацыя павінна прыняць у эксплёатацыю пабудаваныя ільназаводы. Неабходна значна ўзмацніць тэмпы падрыхтоўкі кадраў для ільназаводаў — сартоўшчыкаў, кіраўнікоў зьмен і інш. Трэба ўжо зараз прыступіць да вярбоўкі рабочай сілы для **10-ці** ільназаводаў, якія будуць пушчаны ў першую чаргу.

ІЛЬНАКАНАПЛЯВОДТРЭСТ.

Для правядзеньня ўборачнай кампаніі па падліках трэсту ў саўгасах яго хопіць на **50** проц. рабочай сілы. Аднак, і тут да заключэньня дагавароў з калгасамі на рабочую сілу не прыступілі. Зьдзельшчына яшчэ не ўкаранена ў саўгасах. Няма правільнай і выразнай расстаноўкі і скарыстаньня рабочай сілы.

БЕЛІЛЬНАСАЮЗ.

Белільнасаюз па-апартуністычнаму адпёсься да справы ўборкі, усіх не падрыхтаваўся да яе, да апрацоўкі і загатоўкі ільну. У чаканьні пастановы Наркамзему аб рэарганізацыі, Белільнасаюз самаліквідаваў сябе. Зусім недапушчальна безадказным зьяўляецца выступленьне на нарадзе прадстаўніка Белільнасаюзу, які імкнуўся замазаць правапартуністычную практыку спасыланьнем на аб'ектыўныя прычыны. Белільнасаюзу неабходна зараз-жа выступіць да практычнай работы па падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі.

ТАКОЕ СТАНОВІШЧА З ПАДРЫХТОЎКАЙ У АСНОЎНЫХ ЦЭНТРАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ І АРГАНІЗАЦЫЯХ, ЯКІЯ АДКАЗВАЮЦЬ ЗА ПАСЬПЯХОВАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЎБОРКІ, АПРАЦОЎКІ І ЗАГАТОЎКІ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ, ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЗУСІМ НЕДАПУШЧАЛЬНЫМ. НЕАБХОДНЫ ГРУНТОЎНЫ ПЕРАЛОМ, НАЛАДЖВАНЬНЕ ГІБКАГА АПЭРАЦЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА ЎБОРАЧНАЙ І АПРАЦОЎЧАЙ КАМПАНІІ ТЭХКУЛЬТУР.

Як-жа падрыхтаваліся да ўборкі ільну і канапель тыя ўстановы і арганізацыі, якія павінны садзейнічаць пасьпяховаму правядзеньню ўборкі і апрацоўкі, ад якасьці работы якіх у пэўнай ступені залежыць пасьпяховае правядзеньне ўборкі?

БЕЛСЕЛЬСНАБ.

Плян завозу машын па ўборцы і апрацоўцы ільну ідзе надзвычай марудлівымі тэмпамі. Плян завозу ільнамялак выкананы на **5** проц., ільнатрашчотак — на **25,7** проц. Плян загатоўкі машын — малатарань **«Эддзі»** зусім не выкананы. Усё гэта стварае пагрозу зрыву пляну забясьпечэньня машынамі. Мы патрабуем від Белсельснабу разгортваньня выстарчальнай ударнай работы, каб забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў завозу і загатоўкі машын.

НАРКАМСНАБ.

Па раёнах яшчэ дагэтуль чыма плянаў забясьпячэньня тавярамі ў часе ўборкі. Наркамснаб ня мае плянаў завозу тавараў у БССР, ня ведае, што і колькі чаго будзе завезена. Досыць доўгі час ужо, як разьвярсталі тавары коштам у **720.000** руб. па раёнах, аднак, у Наркамснабе дагэтуль невядома ці прыбылі гэтыя тавары ў раёны, ці не?

Наркамснаб яшчэ дагэтуль ня мае плану загатовак ільну і канапель.

***

Вывад можа быць толькі адзін, які і зроблены на гэтай нарадзе.

Цэнтральныя арганізацыі і ўстановы недапушчальна марудзілі тэмпамі правядзець падрыхтоўчую работу да ўборкі і апрацоўкі ільну і канапель. **Асабліва і недапушчальна безадказьнейшай зьяўляецца практыка Белільнасаюзу,** які зусім нічога не зрабіў у справе падрыхтоўкі да ўборкі.

Апартунізм, абломаўшчына, непаваротлівасьць, на радзе пучыстаў у падрыхтоўцы да ўборкі і апрацоўкі ільну і канапель — яшчэ ёсьць. У радзе ўстаноў яшчэ няма і дагэтуль пэрсанальна адказных работнікаў, ёсьць абязьлічка, прычына якой — адсутнасьць адказнасьці кожнага з работнікаў за даручаную яму справу.

Увесь друк БССР, пачынаючы ад цэнтральнага і канчаючы раённым, шматтыражкамі і насьцянгазэтамі, павінен максымальна ўзмацніць сваю барацьбу за бальшавіцкія тэмпы ўборкі, апрацоўкі і загатоўкі ільну і канапель.

Ні на адну хвіліну не забываць таго, што ўборачная кампанія тэхкультур папітычна-адказьнейшая задача.

Ні на адну хвіліну не забываць таго, што цераблёнае ільну пачынаецца ў бліжэйшыя-ж дні.

Пасьпяховае правядзеньне ўборачнай і апрацоўкі ільну і канапель замацуе тыя перамогі, якія былі атрыманы на сяўбе тэхнічных культур у час веснавой пасеўнай кампаніі.

А. Л.

Хутчэй перабудаваць работу органаў працы

НА НАРАДЗЕ ПРЫ НАРКАМПРАЦЫ

Спрэчкі па дакладу Наркампрацы тав. **Баскіна** — яркая ілюстрацыя неабходнасьці самай рашучай перабудовы органаў працы, усёй сыстэмы вярбоўкі і падрыхтоўкі рабочай сілы.

Тав. **Партны** (Менск) паказвае на тую пераспаравдчасьць, якая ёсьць у апараце Наркампрацы. Часта Наркампрацы выдае нарады на вярбоўку рабочай сілы некалькім арганізацыям у адным і тым-жа раёне. У выніку паміж вярбоўшчыкамі ствараюцца надзвычай няпрыемныя ўзаемаадносіны, нешта накшталт «канкурэнцыі».

Да гэтага часу не наладжан сапраўдны ўлік патрэбнай кваліфікаванай сілы. Так, курсы ЦІП'у ў бліжэйшы час выпускаюць 90 вадаправодчыкаў, але заявак на іх ні адкуль няма.

Прамоўцы зварачалі асаблівую ўвагу на пытаньне ўкараненьня жаночай працы ў прамысловасьць. Як аказваецца, за апошні час ёсьць вялікая цякучасьць жаночай працы з вытворчасьці. Гэта ў большасьці тлумачыцца тым, што гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі ня ўжылі рашучых мер да разгортваньня сеткі ясьляй, пляцовак і г. д.

Тав. **Мігдановіч (Рэчыца)** паведамляе аб тым становішчы, у якім знаходзіцца падрыхтоўка ціпаўцаў у Рэчыцы. Ціпаўцы дрэнна забясьпечваюцца прадуктамі харчаваньня, па два месяцы ня выплачваецца ім зарплата і інш. Тав. Мігдановіч прыводзіць факты, калі вярбоўшчыкі гаспадарчых арганізацый пераманьваюць рабочых з аднаго заводу на другі.

Рад прамоўцаў адзначалі, што пастанова ўраду аб адыходніцтве не папулярызавана сярод калгасьнікаў, што дагаворная кампанія з калгасамі на рабочую сілу не пачата, што да гэтага часу інжынэрна - тэхнічны пэрсанал мала займаўся пытаньнямі арганізацыі працы, і што неабходна вялікую ўвагу зьвярнуць на падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў **на вытворчасьці.** Зусім недапушчальным зьяўляецца той факт, што Крычаўскі цэмзавод адмовіўся рыхтаваць кваліфікаваную рабочую сілу на вытворчасьці.

Тав. **Пушны** (Ворша) прыводзіць факт, што з-за адсутнасьці бараку для сэзонных рабочых, на будаўніцтве, дзе працавала 750 рабочых, засталося толькі 350.

Органы працы справяцца са сваімі задачамі толькі пры ўмове актыўнай дапамогі з боку ўсёй рабочай грамадзкасьці. Дырэктыва аб выбары грамадзкіх інспэктараў павінна быць выкананa неадкладна. Прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі павінны прыняць непасрэдны ўдзел у перабудове работы па вярбоўцы і падрыхтоўцы кадраў.

Міх. Бал—коў.

Усебеларуская піянэрская спартакіяда

27 ліпеня на спартыўным стадыёне адкрылася другая Усебеларуская піянэрская спартакіяда. Пасьля кароткага мітынгу спартакіяда адкрылася ўрачыстым парадкам усіх удзельнікаў.

Былі праведзены спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы (скачкі ў вышыню, бег на 80 і 60 мэтраў і інш.).

Па бегу на 80 мэтраў першае месца заняў менскі піянэр **Вальфсон** (10,3 сэкунды), на 60 мэтраў першае месца заняла гомельская піянэрка (8,7 сэк.).

Культпроп ЦК КП(б)Б 31-га ліпеня г. г.
СКЛІКАЕ
ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ НАРАДУ
рэдактароў раённых газэт ільнаканапляводчых раёнаў з удзелам пралетаўнікоў цэнтральных устаноў (Калгасцэнтру, Наркамзему, Ільнаканаплябудбанку і г. д.). Нарада адбудзецца ў 4 гадз. дня ў памяшканьні малой залі ЦК КП(б)Б
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Пытаньні ўборкі і першапачатковай апрацоўкі ільну і канапель і задачы цэнтральнага і раённага друку (дакладчыкі: НКЗ, Калгасцэнтр).
2. Даклады газэт: цэнтральных—«Калгасьнік Беларусі», «Чырвоная Зьвязда»; раённых: горацкай і лепельскай.
На нараду абавязкова ўкліча рэдактароў раённых газэт (ільнаканапляводчых раёнаў) і камуністаў-работнікаў усіх цэнтральных газэт.
КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

Рэдакцыя «Акцябр», партыйныя калектывы Белкаапсаюзу і ЦРК, ЦП саюзу каапгандальслужачых
скліканьне на обмьмя, на 30-га ліпеня г. г., у 8 гадзін вечара, у клюбе саўгандальслужачых (рог Энгельса і Камуністычнай),
агульна-гарадзкі сход
рабкораўскіх брыгад «АКЦЯБРА», рабкораў-ударнікаў, каапактыву на прадпрыемствах і каапработнікаў у сыстэме спажывецкай каапэрацыі.
АБ ХОДЗЕ ПЕРАБУДОВЫ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ
(Вынікі кантрольнай дэкады)
Даклады Белкаапсаюзу і рэдакцыі «АКЦЯБР».
Запрашаюцца брыгады рабкоры газэт «ЗЬВЯЗДА», «РАБОЧЫ», «СЛАВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА», представаўнікі ЦКК-РСІ, пракуратуры, ВСНГБ, Белдзяржкізбу, ЦСПСБ, гарпрафсавету, Калгасцэнтру і інш.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Першая гукавая мастацкая карціна Пуцёўка ў жыцьцё. Драма ў 34 эпізодах
„КУЛЬТУРА" Пач. у 7; 8-45; 10-30 — Новая высёлая камэдыя СТАНЦЫЯ ПУПКІ.
Інтэрнацыянал Пач. у 7 г. веч. — БАБЫ РАЗАНСКІЯ. Рэжысэр Вольга Прабражэнская. У гал. ролях: З. Цвасэвская, Р. Пужная.
„Пралетары" Адкр. з 12 г. дня. — 2 серыі, 18 част. у адзін сэанс СТЕНЛЕЙ у нетрах Афрыкі.
„ЮНЫ ПІЯНЭР". — Гэтымі днямі ў памяшканьні кіно „Культура" адбудзецца адрыцьцё кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР" сачэце за рэкламай.
„СПАРТАК" Пач. у 7, 9, і 11, Каса—з 5 гадз. — Замежны фільм ЧАЛАВЕК, ЯКІ СЬМЯЕЦЦА ў 10 частках

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
у ВІЦЕБСКІ ПАЛІТЭХНІКУМ
праца гнут да 25 жніўня г.г.
Набор студэнтаў праводзіцца на наступныя аддзяленьні: энергэтычнае: 1) па электрыфікацыі фабрык і заводаў—30 асоб, 2) па электрыфікацыі сельскай гаспадаркі—30 чал., 3) цеплатэхнічнае—30 чал.; механічнае: 1) па халодным апрацоўцы матэляў—30 асоб; 2) па гарачай апрацоўцы матэляў—30 асоб, 3) на мэханіку абуткавых машын—30 чал.
Апрача гэтага адкрыт прыём на 2-гі і 3-ці курсы палітэхнікумаў на 2-гі курс па энэргетычным аддзяленьні: 1) па электратэхнічнай спэцыяльнасьці—5 асоб, цеплатэхнічнай—5 асоб; па мэханічным аддзяленьні: 1) па халодным апрацоўцы матэляў—8 асоб, і на 3-ці курс—10 асоб, з якіх 5 чал. на электратэхнічнае і 5 чал.—на мэханічнае аддзяленьні.
На 2-гі і 3-ці курсы прымаюцца асобы, скончыўшыя прафтэхнікуму або ФЗВ на базе 7-годзі з 2-гадовым вытворчым стажам выключна рабочыя і галоўным чынам ударнікі.
Для асоб, жадаючых паступіць на апошні курс, устанаўляюцца залікі.
Дакуманты прымаюцца, згодна правіл паступленьня тэхнікумы.
ДЫРЭКЦЫЯ.

У ленінградзкім гісторыка-лінгвістычным інстытуце
Беларуская сэкцыя Цэнтральнага Выдавецтва Народаў СССР пры ЦВК СССР у Маскве мае ў сакім распраджэньні 6 месцаў
З месцы на рэдактарскае аддзяленьне і 3—на адд. перакладчыкаў.
Асобы, жадаючыя паступіць у вышэйшы інстытут, могуць падаваць заявы і ўсе неабходныя для паступленьня ў ЕНУ дакуманты на адрасе:
„Москва, Ленинская, 10, Центриздат, Белсекция".
Дакуманты прыслаць не пазьней 15 жніўня г. г.
Умовы прыёму: для паступленьня на рэдактарскае аддзяленьне неабходна мець 3-гадовы партстаж, пераважна прымаюцца рабочыя і калгаснікі-ударнікі. На адд.